ДАНІЭЛЬ ЯСТРЭМСКІ: «МАРЫ ЗБЫВАЮЦЦА!»

ЧЫРВОНКА

ШЛЯХІ І АБЛІЧЧЫ БЕЛАРУСКАГА СТЭНДАПА

ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

18 КАСТРЫЧНІКА 2018 г. ЧАЦВЕР № 201 (28817)

Ясная Раніца. Заўсёды

Мікалай ЛАПО жывё ў вёсцы Ясная Раніца Круглянскага раёна амаль сорак гадоў. Вёска нечым нагадвае Белыя Росы (з аднайменнай кінастужкі), бо знаходзіцца каля самага райцэнтра, прымыкае да новабудоўляў. Але пенсіянеру, які ўсё жыццё аддаў сельскай гаспадарцы, не хацелася б, каб Ясная Раніца знікла. Яму падабаецца, што ў вёсцы ўзводзяць новыя дамы, па суседстве жывуць маладыя гаспадары, і гэта азначае, што населены пункт з такой арыгінальнай назвай будзе радаваць і наступныя пакаленні. Мікалай Іванавіч у свае 70 гадоў па-ранейшаму любіць назіраць за прыродай, часта здымае яе на мабільнік, каб паказаць іншым: вось якая яго раніца — ясная.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

ЦЫТАТА ДНЯ

Сяргей РУМАС, прэм'ер-міністр:

«Дзяржпошліна на допуск да дарожнага руху не будзе ўключацца ў кошт паліва. Асноўным рашэннем пытання ўрад бачыць адвязванне выплаты пошліны ад праходжання тэхагляду. Права на доступ да дарожнага руху кіроўцы будуць аплачваць у АРІП — на тэрмін ад аднаго месяца. Такім чынам будзе адноўлена справядлівасць у дачыненні да тых асоб, хто выкарыстоўвае аўтамабіль не круглы год. Самае складанае тут — сістэма кантролю, якая дазволіць выяўляць тых, хто збор не заплаціў. Вырашаць пытанне з неплацельшчыкамі пошліны дапаможа параўнанне базы АРІП з базамі фотафіксацыі і праходжання тэхагляду. І тады, хто не заплаціў за допуск да руху, будзе плаціць у падвойным памеры. Новая схема, па папярэдніх даных, запрацуе з 1 ліпеня 2019 года».

КАРАТКА

- **У беларускіх санаторыях забраніравана каля 90 % месцаў на навагодні сезон з 25 снежня па 8 студзеня. 40 % з іх прыпадае на расіян.**
- Сіноптыкі раяць завяршыць уборку бульбы і агародніны з-за будучага пахаладання.

- **Больш за 8,5 тысячы дзяцей Гомельскай вобласці паправяць здароўе на восеньскіх канікулах у прышкольных лагерах з дзённым знаходжаннем.**
- Новыя дзіцячыя садкі ў 2019 годзе з'явяцца ў Астраўцы і Лідзе.
- **Крымінальная справа распачата ў дачыненні да мінчаніна, які страляў па птушках.**

ISSN 1990 - 763X

■ Да 1000-годдзя Брэста

І ГАРАДСКІ САД, І ВАКЗАЛ — НА АДНОЙ СЦЯНЕ

Арт-аб'ект на тэму гарадской гісторыі ствараецца па вуліцы Міцкевіча

Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

На вялікай сцяне па вуліцы Міцкевіча ў Брэсце літаральна на вачах у мінакоў нараджаюцца карцінкі гарадскога жыцця пачатку мінулага стагоддзя. Пано, якое складаецца з некалькіх асобных сюжэтаў, мастакі абяцаюць закончыць ужо ў кастрычніку. Калі, вядома, надвор'е не падвядзе.

СТАР. 13

Людзі і лёсы

«У маё жыццё прыйшло вялікае шчасце...»

Як гэта было: шчыры аповед аб усынаўленні

Алене хутка будзе 44, яна выкладае ў адным са сталічных універсітэтаў. Два гады таму жанчына ўсынавіла чатырохгадовага хлопчыка. Я адчуваю сябе крыху няёмка, калі задаю пытанне аб тым, чаму няма сваіх дзяцей. Але такая ўжо прафесія — насуперак прыказцы казаць пра вяроўку ў доме павешанага. «Нічога, для мяне гэта не такая балючая тэма, як для некаторых», — супакойвае мяне Алена. І пачынае расказваць...

— ...У маладосці было неяк не да таго. Калі мы з маім выбраннікам пажаніліся, вырашылі адкласці на некаторы час нараджэнне дзяцей: не было свайго жылля, дый наогул вырашылі, што пакуль яшчэ рана. А потым пачаўся перыяд, калі ў мяне не было даверу да свайго мужа і я не хацела нараджаць у гэтай сітуацыі. У рэшце рэшт усё скончылася скасаваннем шлюбу...

Гэта быў складаны перыяд для мяне. І я з галавой акунулася ў працу, нават адбыўся значны рывок у кар'еры... Мне было тады 30 гадоў. Вядома, хацелася мець сям'ю, хоць я і не той чалавек, для каго самае галоўнае — выйсці замуж *(усміхаецца)*. Я вяла актыўны лад жыцця, шмат падарожнічала, знаёмілася з мужчынамі. Але знайсці чалавека, з якім хацелася і атрымалася б стварыць сям'ю, не ўдалося. Хоць і лічу: яшчэ не ўсё скончана...

СТАР. 4

ПАВЫШАЮЧЫ ПРЭСТЫЖ

Заснаваны прафесійнае свята і афіцыйная геральдыка МЗС Беларусі

Кіраўнік дзяржавы падпісаў Указ № 411. У адпаведнасці з ім заснаваны эмблема і сцяг Міністэрства замежных спраў, нагрудны знак адрознення органаў дыпламатычнай службы, нагрудны знак адрознення органаў дыпламатычнай службы «За заслугі ў дыпламатычнай службе», нагрудны знак адрознення органаў дыпламатычнай службы «Партнёрства», а таксама форменнае адзенне дыпламатычных работнікаў.

Цікава, што форменнае адзенне маюць права насіць дыпламатычныя работнікі, якім прысвоены дыпламатычныя рангі Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла першага класа, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла другога класа. Акрамя таго, з'явілася і прафесійнае свята — Дзень дыпламатычнага работніка. Ён будзе адзначацца штогод 22 студзеня.

Дата мае гістарычныя карані: яна звязана з гісторыяй першага знешнепалітычнага ведамства ў перыяд станаўлення (1919—1920 гады) дзяржаўнасці Беларусі — Камісарыята замежных спраў ССРБ. Так, 22 студзеня 1919 года ў газеце «Звязда» была размешчана першая публічная аб'ява аб пачатку дзейнасці камісарыята і вызначана месца яго размяшчэння — горад Мінск.

Дарэчы, іншым указам устаноўлены юбілейны медаль «100 год дыпламатычнай службе Беларусі» — у азнаменаванне 100-годдзя стварэння айчыннай сістэмы органаў дыпламатычнай службы.

Паводле БелТА.

На слыху

ДНК-ДЫЯГНОСТЫКА — НЕ ПРЫСУД,

або Навошта рабіць генетычны пашпарт?

ДНК чалавека можа расказаць пра многае: пра яго схільнасць да развіцця тых ці іншых захворванняў, індывідуальную адчувальнасць да лекавых прэпаратаў, перспектывы спартыўных перамог і нават пра яго псіхаэмацыянальныя асаблівасці. Заўважана, напрыклад, што аптымісты жывуць даўжэй. Можа быць, у хуткім часе гэта змогуць даказаць і на навуковай аснове?

У Інстытуце генетыкі і цыталогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ўжо распрацавана праграма вызначэння псіхаэмацыянальнага статусу чалавека: яна ўключае апаратныя метады псіхафізіялагічнага тэсціравання, якія ў адрозненне ад псіхалагічных тэстаў аб'ектыўна ацэньваюць стан чалавека. Навукоўцы спадзяюцца, што параўнанне вынікаў псіхафізіялагічнага тэсціравання з данымі малекулярна-генетычнага аналізу дазволіць выявіць найбольш інфарматыўныя гены, асацыяваныя з псіхаэмацыянальнымі асаблівасцямі чалавека, і распрацаваць ДНК-тэхналогію вызначэння схільнасці да асобасных расстройстваў, асацыяльных паводзінаў, уключаючы схільнасць да агрэсіі, суіцыдаў, дэпрэсіі і гэтак далей.

— Мы нараджаемся на свет флегматыкамі або халерыкамі, і нават асяроддзе, у якім выхоўваецца дзіця, не можа моцна паўплываць на яго псіхатып, — разважае **загадчыца лабараторыі генетыкі чалавека Інстытута генетыкі і цыталогіі Ірма МАССЭ.** — Наколькі нашы псіхаэмацыянальныя асаблівасці залежаць ад генаў, мы і спрабуем зараз высветліць...

Да таго ж ёсць экстрэмальныя прафесіі, дзе наяўнасць мужнасці павінна быць прапісана ў анкеце, дзе патрабуецца імгненная рэакцыя на сітуацыю, якая рэзка змянілася, устойлівасць да каласальных псіхаэмацыянальных нагрузак, таму даследаванні на стрэсаўстойлівасць будуць асабліва карысныя пры прыёме на працу ў падраздзяленні МНС, МУС і іншыя ведамствы. Пакуль што тэхналогія ў стадыі распрацоўкі. З мінулага года распачалася рэалізацыя навуковай праграмы Саюзнай дзяржавы «ДНК-ідэнтыфікацыя», у рамках якой вядуцца навуковыя даследаванні ў гэтай галіне.

Але ўжо сёння ў лабараторыі генетыкі чалавека можна прайсці генетычнае тэсціраванне і даследаваць 60 самых важных генаў.

— Увогуле ў чалавека 25 тысяч генаў, але нас не цікавяць гены, якія адказваюць за форму пазногця, вуха ці радзімкі. Тым не менш прыкладна сотню генаў, якія ўносяць вялікі ўклад у здароўе чалавека і яго працягласць жыцця, было б цікава вывучыць, — канстатуе Ірма Массэ.

Атрымаць генетычны пашпарт можа абсалютна любы чалавек. Гэта можа быць як невялікае даследаванне, скажам на адчувальнасць чалавека да медыцынскага прэпарату, так і поўнае. Напрыклад, у лабараторыі генетыкі чалавека сёння правяраюць 14 генаў, ад якіх можа залежаць нармальнае працяканне цяжарнасці. Гэта адна з самых запатрабаваных працэдур. Паводле апошніх даследаванняў, адной з галоўных прычын страты цяжарнасці з'яўляецца спадчынная тромбафілія. Генетычная схільнасць да яе ніяк не праяўляецца да таго моманту, пакуль жанчына не зацяжарыць. Менавіта цяжарнасць становіцца правакуючым фактарам. Таму нават пры планаванні мацярынства жанчына, якая праходзіць папярэднюю дыягностыку, чуе ад урача: «Усе паказчыкі ў вас у норме, можаце цяжарыць...» Аднак першая, другая і кожная чарговая спроба нарадзіць дзіця завяршаецца выкідышам або цяжарнасць замірае.

Генетычнае тэсціраванне дазваляе выяўляць прычыны парушэння працякання цяжарнасці ў кожным канкрэтным выпадку.

— Калі ДНК-аналіз указвае на высокую рызыку ўтварэння тромбаў, гэта яшчэ не прысуд. З дапамогай тэрапеўтычнай карэкцыі, якую могуць правесці ўрачы, цяжарнасць можна захаваць і нарадзіць здаровае дзіця, — тлумачыць Ірма Массэ. — Нашы даныя сведчаць, што 86,6 % жанчын, якія не маглі вынасіць дзіця, паспяхова нарадзілі, а дзве нават вынасілі двойню.

ДНК-тэсціраванне дазваляе ўстанавіць генетычныя фактары рызыкі развіцця сардэчна-сасудзістых захворванняў, атэрасклерозу, астэапарозу, дыябету, вянозных трамбозаў, рэўматоіднага артрыту і гэтак далей. Асабліва актуальная такая інфармацыя для людзей, сваякі якіх мелі ў анамнезе гэтыя захворванні. Гэтыя веды дазваляюць ажыццявіць раннюю дыягностыку паталогій, карэктна вызначыць прагноз развіцця небяспечных ускладненняў і правільна выбраць метады прафілактыкі і лячэння.

— Генетычная дыягностыка — не прысуд, а кіраўніцтва да дзеянняў, — падкрэслівае спецыяліст.

Каб зрабіць генны аналіз, ватовай палачкай збіраюць эпітэлій з унутранага боку шчакі. Кроў не патрабуецца. На сённяшні дзень ужо выдадзена амаль 13 тысяч генетычных пашпартоў. Між іншым, лабараторыя генетыкі чалавека Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі адзіная ў СНД мае міжнародную акрэдытацыю ў гэтай галіне. Каб трапіць сюды, накіраванне не патрэбна, паколькі ДНК-тэсціраванне — працэдура платная.

Атрымаць генетычны пашпарт можа абсалютна любы чалавек. Гэта можа быць як невялікае даследаванне, скажам на адчувальнасць чалавека да медыцынскага прэпарату, так і поўнае.

Улічваючы тэндэнцыі развіцця генетыкі, многіх цікавіць пытанне падаўжэння жыцця чалавека.

— Магчымасць рэдагаваць ДНК тэарэтычна дае нам шанц жыць вельмі доўга (такія эксперыменты на жывёлах ужо вядуцца), але гэта цягне шэраг этычных пытанняў. Таму на дадзены момант асноўная задача заключаецца ў паляпшэнні якасці жыцця, а не ў павелічэнні яго працягласці, — падкрэслівае Ірма Массэ.

Зараз у Беларусі ўзрост больш як 100 гадоў маюць амаль 450 чалавек. **Вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі экалагічнай генетыкі і біятэхналогіі Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі Алена МІХАЛЕНКА** расказала, што вучоныя Беларусі і Сардзініі праводзяць сумесныя даследаванні па генетыцы даўгалецця: «Мы супрацоўнічаем з кафедрай геранталогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, з універсітэтам Кальяры на Сардзініі. Гэты востраў — адзін з пяці рэгіёнаў свету з найбольшай колькасцю доўгажыхароў. Разам вывучаем генетычныя асаблівасці доўгажыхароў у Беларусі і Сардзініі. І там, і ў нас найбольшая колькасць людзей з вялікай працягласцю жыцця жывуць у сельскай мясцовасці, а гэта цяжкая фізічная праца і пэўная дыета з вялікім спажываннем малака і малочных прадуктаў...

Спецыялісты сцвярджаюць, што генетычныя асаблівасці ўплываюць на здароўе і даўгалецце на 25 %, а астатнія 75 % — гэта лад жыцця і навакольнае асяроддзе.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Трагедыя ў керчанскім каледжы

У яе выніку Керчы, па папярэдніх даных, 19 чалавек загінулі, яшчэ каля 50 пацярпелі, перадае ТАСС са спасылкай на СК Расіі.

Раней агенцтву «Крымінфарм» у Крымскім рэспубліканскім цэнтры медыцыны катастроф паведамлялі аб 10 загінулых.

На месца здарэння выязджалі пяць брыгад хуткай дапамогі з Керчы і некалькі брыгад медыкаў з навакольных населеных пунктаў.

«Мы з хлопцамі стаялі на вуліцы, у гэты ж момант пачуўся моцны хлапок. Вокны на двух паверхах проста выпалі», — паведаміў агенцтву «КерчІнфа» сведка. Мінакі і вучні каледжа дапамагалі выносіць пацярпелых.

Таксама паведамлялася, што ў бальніцы сцягвалі студэнтаў-медыкаў, яны дапамагалі прымаць пацярпелых, сярод якіх вельмі шмат цяжкіх.

Акрамя таго, як сцвярджаюць відавочцы, перад выбухам на першым паверсе першага корпуса была стральба. Па лініі экстранных службаў праходзіла інфармацыя, што ў каледжы спрабавалі захапіць заложнікаў, пасля гэтага і пачалася стральба, затым — выбух.

Канал таксама прыводзіць сведчанні відавочцаў, па словах якіх, керчанскі стралок падарваў бомбу, калі ў яго скончыліся патроны.

Малады чалавек, які ўстроіў стральбу і выбух у керчанскім каледжы, мог дзейнічаць не адзін. Асоба стралка ўстаноўлена: гэта Уладзіслаў Раслякоў, яму было 18 гадоў, паведаміла РБК афіцыйны прадстаўнік СК Расіі Святлана Пятрэнка. Малады чалавек знойдзены мёртвым на другім паверсе каледжа, ён, як паведамляе Telegam-канал «112», пакончыў з сабой.

МЗС Кубы абвінаваціў ЗША ў дэзынфармацыі ААН пра палітвязняў у краіне для падаўжэння эмбарга

Антыкубінскія інфармацыйныя кампаніі ЗША накіраваны на тое, каб апраўдаць гандлёва-эканамічнае і фінансавае эмбарга супраць рэспублікі, якое працягваецца з 1962 года, а палітычных зняволеных у краіне няма. Такая пазіцыя змяшчаецца ў заяве, распаўсюджанай міністэрствам замежных спраў Кубы.

«Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Куба самым рашучым чынам адхіляе паклёпніцкую кампанію супраць Кубы адносна правоў чалавека, распачатую 16 кастрычніка ўрадам ЗША ў штаб-кватэры ААН, — заявілі ў МЗС, каментуючы запушчаную ЗША інфармацыйную кампанію пад назвай «Jailed for what?» («У турму за што?»), якая звяртае ўвагу на нібыта наяўнасць на востраве каля 130 палітвязняў. — У нашай краіне няма палітычных зняволеных з моманту перамогі рэвалюцыі ў 1959 годзе».

Знешнепалітычнае ведамства карыбскай краіны ў сваю чаргу адзначыла наяўнасць у ЗША праблем з расавай дыскрымінацыяй, узроўнем беднасці пэўных слаёў насельніцтва, гвалту з боку паліцыі, падзелу сем'яў мігрантаў, а таксама практыкі катаванняў.

Біблію пераклалі на тысячную мову

У Паўднёвым Судане, дзе пражывае народнасць келіка, урачыста адзначылі пераклад Біблії на тысячную мову свету. Пра гэта паведаміла выданне Christian Post.

Цырымонія асвячэння Новага запавету на мове келіка прайшла ў лагеры бежанцаў Бідзі-Бідзі, другім па велічыні лагеры бежанцаў, дзе сёння пражывае 250 тысяч чалавек. Тысяча моў, на якія Біблія перакладзеная, — гэта дзясятая частка ўсіх моў свету. Працягваюцца пераклады Біблії на 2500 моў, многія з іх хутка будуць завершаны. Засталося яшчэ каля 1600 моў, на якія пераклад яшчэ не пачынаўся. Перакласці Свяшчэннае Пісанне на ўсе мовы свету плануюць да 2025 года.

Абітурыент-2019

ЗАЛАТАЯ СЯРЭДЗІНА,

або Новы пункт адліку ў ЦТ

Вынікі рэпетыцыйнага тэсціравання, якое праводзіцца ў 2018—2019 гадах, будуць разлічвацца з выкарыстаннем новай методыкі падліку тэставага бала. Як паведамляецца на сайце арганізатараў — Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў — гэта робіцца ў мэтах захавання пераемнасці вынікаў рэпетыцыйнага і цэнтралізаванага тэсціравання.

Крыху раней **першы намеснік міністра адукацыі Ірына СТАРАВОЙТАВА** анансавала ў сваім інтэрв'ю БелТА ўвядзенне падчас прыёмнай кампаніі 2019 года новай сістэмы апрацоўкі вынікаў ЦТ. Яна расказала, што сёлета эксперыментальна, паралельна з наяўнай сістэмай апрацоўкі вынікаў ЦТ, апрабавалася і новая методыка. Пры той сістэме падліку балаў, якая дзейнічала з моманту ўвядзення ў нашай краіне цэнтралізаванага тэсціравання, вынік удзельніка залежаў ад таго, як справіліся з канкрэтным заданнем іншыя абітурыенты, і ўсе яны паміж сабой ранжыраваліся. Але ад гэтай сістэмы вырашылі адмовіцца. У Міністэрстве адукацыі лічаць, што цяпер вынікі пераважнай большасці ўдзельнікаў ЦТ будуць набліжаны да выніковай атэстацыі ў школе і адлюстроўваць іх рэальны ўзровень ведаў. Пасля прадвядзення сёлетняга цэнтралізаванага тэсціравання ў міністэрстве параўналі вынікі эксперымента і ранейшай сістэмы і прыйшлі да высновы, што ў новай методыкі ёсць свае плюсы. Якія менавіта, разабрацца пакуль досыць складана, хоць на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў можна знайсці тлумачэнні да новай сістэмы падліку балаў.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

У прыватнасці, там паведамляецца, што падлік вынікаў будзе ажыццяўляцца ў два этапы. Кожнаму тэставаму заданню прысвойваецца першасны бал, яго абітурыенты будуць ведаць яшчэ да пачатку ЦТ. Ён будзе залежаць ад некалькіх паказчыкаў — узроўню складанасці задання, формы яго прадстаўлення, у якой частцы тэста знаходзіцца заданне (у вобласці А ці В), адкрытае яно ці закрытае.

Напрыклад, у заданнях з выбарам двух і больш правільных адказаў у выпадку, калі дадзены больш чым адзін няправільны адказ, не ўказана больш аднаго правільнага адказу, а таксама дадзены хоць адзін няправільны і адначасова не ўказаны хоць бы адзін правільны адказ, заданне прызнаецца выкананым няправільна (дапушчана больш чым адна памылка).

Затым у працэсе праверкі работ будуць уведзены каэфіцыенты і далей разлічвацца выніковы тэставы бал. Свой рэйтынг абітурыенты змогуць убачыць на сайце РІКВ.

Арганізатары сцвярджаюць, што ўдзел у рэпетыцыйным тэсціраванні дазволіць абітурыенту не толькі вызначыць існуючыя прабелы ў ведах па вучэбным прадмеце, але і ацаніць свой бягучы ўзровень падрыхтоўкі ў параўнанні з іншымі ўдзельнікамі.

Трэба дадаць, што методык апрацоўкі вынікаў тэстаў у свеце шмат — ад вельмі простых да вельмі складаных. У нашай краіне імкнуцца знайсці залатую сярэдзіну: каб для ўсіх (і абітурыентаў, і бацькоў, і педагогаў) гэты падыход быў зразумелы, і каб адначасова выконваліся дзве функцыі — ранжыравання і ацэньвання ведаў. Раней бацькам было незразумела, чаму іх дзіця атрымлівае ў школе «васьмёркі» па прадмеце, а на тэсціраванні набірае ўсяго 30 балаў. І ўзнікалі пытанні: або школы завышаюць адзнакі, або тэсты вінаватыя? Ці зменіцца сітуацыя цяпер? Шанцы абітурыентаў 2019 года можна будзе ацаніць па новай методыцы ўжо пасля першага раўнду рэпетыцыйнага тэсціравання.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Не сезон

ЧАСОВА ТУТ ПАКУЛЬ НЕ ПАЛОВІШ

Забарона на рыбалоўства ўводзіцца на ўчастках Нёмана і Аўгустоўскага канала.

З 15 кастрычніка да 15 красавіка ўводзіцца забарона на аматарскае рыбалоўства на ўчастку Нёмана ў раёне водазабора каўшовага тыпу ААТ «Гродна Азот» каля вёскі Пагараны Гродзенскага раёна. Пад забарону трапіў участак працягласцю ў 50 метраў ад межаў водапрыёмнага каўша водазабора ўверх і ўніз па цячэнні, а таксама тэрыторыя водазабора.

Акрамя таго, забарона на аматарскае рыбалоўства ўведзена на ўчастку Аўгустоўскага канала на адлегласці 350 метраў ад месца яго ўпадзення ў Нёман да дальняга ад ракі краю бетоннага прычала для суднаў «Дзмісевічы». Абмежаванні тут таксама будуць доўжыцца да 15 красавіка.

У выпадку незаконнай здабычы парушальніку пагражае адміністрацыйная адказнасць у выглядзе штрафу ў памеры ад 20 да 50 базавых велічынь, таксама давядзецца пакрыць нанесеную навакольнаму асяроддзю шкоду. Напрыклад, за адну асобіну судака — 18 базавых велічынь, ляшча або шчупака — 9 базавых. За акуня, плотку або гусцяру давядзецца пакрыць 3 базавыя велічыні.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Здарэнне

ДЗЕЦІ НА ПАДАКОННІКУ

Яны стаялі на пятым паверсе

Ранкам у цэнтр аператыўнага кіравання Светлагорскага раённага падраздзялення МНС паступіла паведамленне аб тым, што на падаконніку пятага паверха дома па вуліцы Шасэйнай стаяць двое дзяцей. Фортка акна была адчынена. Да месца аператыўна выехалі ратавальнікі.

Высветлілася, што ў кватэры без нагляду дарослых знаходзяцца дзяўчынка 2016 года нараджэння і хлопчык 2014 года нараджэння. Паводле папярэдняй інфармацыі, маці малалетніх дзяцей прыкладна ў 9 гадзін раніцы з'ехала па асабістых справах, зачыніўшы дзяцей адных у кватэры. Ратавальнікі сумесна з супрацоўнікамі раённага аддзела ўнутраных спраў неадкладна паведамілі ёй пра здарэнне і чакалі прыходу жанчыны. Дзеці ў медыцынскай дапамозе патрэбы не мелі, паведамілі ў МНС.

Пра гэта здарэнне Светлагорскае раённае падраздзяленне МНС праінфармавала старшыню Светлагорскага раённага выканаўчага камітэта, пасля чаго ўсе яго абставіны былі разгледжаны на пасяджэнні рабочай групы па каардынацыі дзейнасці назіральных камісій Светлагорскага раёна. Зараз раённым аддзелам адукацыі вядзецца разбор па гэтым факце.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Крымінал

«ШЫРОКАДЫЯГАНАЛЬНАЕ» МАХЛЯРСТВА

Як паведамілі «Звяздзе» ў Камітэце дзяржаўнага кантролю, фінансавая міліцыя раскрыла шэрую схему гандлю дарагой бытавой тэхнікай.

Упраўленнем Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Мінскай вобласці і горадзе Мінску спынены гандаль бытавой тэхнікай праз інтэрнэт без выплаты падаткаў. Затрымана некалькі чалавек, якія ўвозілі і рэалізоўвалі на тэрыторыі краіны шырокадыяганальныя тэлевізары апошніх мадэляў, гукавыя панэлі і дарагую тэхніку з парушэннем дзеючага заканадаўства.

У поле зроку аператыўнікаў фінансавай міліцыі сталічная фірма па продажы бытавой тэхнікі трапіла яшчэ ў 2017 годзе. Як высветлілася, толькі частку сваіх тавараў камерцыйная структура рэалізоўвала з выплатай усіх падаткаў. Астатнія набывалі і прадавалі за наяўны разлік. Гэтыя здзелкі не адлюстроўваліся ў бухгалтарскай дакументацыі, што дазваляла арганізатарам шэрай схемы не плаціць падаткі пасля рэалізацыі няўлічанай бытавой тэхнікі.

Усяго ў бюджэт не паступіла больш за 570 тысяч рублёў. У дачыненні да кіраўніка камерцыйнай структуры заведзена крымінальная справа па ч. 2 арт. 243 Крымінальнага кодэкса (ухіленне ад выплаты падаткаў у асабліва буйным памеры).

Асобна трэба сказаць, што ў незаконны бізнес былі ўцягнутыя жыхары беларуска-польскага памежжа. «Пад заказ» сталічнай фірмы яны ўвозілі на тэрыторыю краіны бытавую тэхніку, якая захоўвалася ў Мінску ў арандаваным гаражы і прыватным доме кіраўніка камерцыйнай структуры.

У ходзе праверкі выяўлена каля 70 адзінак бытавой тэхнікі без дакументаў, якія пацвярджаюць іх набыццё. Кошт канфіскаваных тавараў складае не менш за 120 тысяч долараў.

Сяргей КУЛАКОЎ.

Тэніс. Напярэдадні падзеі

НЕ ПАЎТАРЫЦЬ МІНУЛУЮ ПАМЫЛКУ

26—27 кастрычніка пройдзе матч другога раўнда плэй-оф I групы Еўра-Афрыканскай зоны Кубка Дэвіса Славакія — Беларусь. Сустрэчы тэнісістаў дзвюх камандаў адбудуцца на корце Нацыянальнага тэніснага цэнтра NTC Aegon Arena ў Браціславе. Нашы сапернікі выбралі для будучага матча грунтавое пакрыццё. Капітан беларускай каманды Уладзімір Валчкоў абвясціў спіс гульцоў, якія прымуць удзел у паядынках. Гэта Ілья Івашка, Ягор Герасімаў, Яраслаў Шыла, Аляксандр Згіроўскі і Максім Мірны. Адзначым, што беларусы сёння займаюць 32-е месца ў рэйтынгу камандаў у Кубку Дэвіса.

Каманда Славакіі ў гэтым спісе знаходзіцца крыху ніжэй — на 35-й пазіцыі. Дома яны выступяць такім складам: Марцін Кліжан, Лукаш Лацка, Філіп Полашэк, Норберт Гомбаш, Ігар Зеленай, капітан каманды — Дамінік Хрбаты.

Нагадаем, найлепшым вынікам для беларускай каманды ў Кубку Дэвіса з'яўляецца выхад у паўфінал Сусветнай групы ў 2004 годзе, а найлепшым у славакаў лічыцца выхад у фінал у розыгрышы 2005 года. Тады на дамашняй арэне ва ўпартым паядынку яны саступілі зборнай Харватыі з лікам 2:3.

На старце цяперашняга сезона ў лютым беларускія тэнісісты прайгралі ў Санкт-Пёльтэне камандзе Аўстрыі з «сухім» лікам 0:5, а ў сярэдзіне верасня ў Маскве саступілі расіянам — 2:3. Славакі ў гэтым сезоне правялі адзін матч, прайграўшы ў пачатку красавіка на сваёй арэне камандзе Босніі і Герцагавіны — 2:3. Гісторыя сустрэч Беларусі і Славакіі налічвае адзін паядынак, ён адбыўся ў верасні 2010 года на кортах Палаца тэніса ў Мінску. На аналагічнай стадыі ў барацьбе за захаванне прапіскі ў I групе Еўра-Афрыканскай зоны наша каманда саступіла славацкім тэнісістам з лікам 1:4. За зборную Беларусі ў тым матчы гулялі Уладзімір Ігнацік, Максім Мірны, Сяргей Бетаў і Андрэй Васілеўскі. Прайграўшы тую матчавую сустрэчу, беларусы апусціліся ў дывізіён рангам ніжэй і пачыналі наступны сезон з II групы Еўра-Афрыканскай зоны.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Ну і ну!

УКРАЎ ТРЫ АЎТАМАБІЛІ

Першы — выйшаўшы з... залы суда

Сталічныя праваахоўнікі затрымалі непрацуючага 28-гадовага жыхара Старых Дарог, які падазраецца ў крадзяжах трох аўтамабіляў на тэрыторыі Фрунзенскага раёна Мінска.

Было ўстаноўлена, што мужчына пайшоў на першы з іх на вуліцы Матусевіча праз тры гадзіны пасля выхаду з залы суда Фрунзенскага раёна Мінска, дзе яго прысудзілі да чатырох гадоў абмежавання волі з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу за здзейснены тры месяцы назад крадзеж аўтатранспарту.

Скрадзены «Фольксваген Пасат» зламыснік пакінуў у лесапаласе недалёка ад Старых Дарог. На наступны дзень мужчына здзейсніў крадзеж машыны аналагічнай маркі з вуліцы Шаранговіча. Гэтым разам ён пакінуў аўто ў дварах дома па вуліцы Вышалескага ў Мінску. Праз некалькі дзён быў скрадзены «Фольксваген Транспарцёр» з вуліцы Адзінцова. Машыну фігурант прыпаркаваў каля рынку ў Дзяржынску. Аператыўнікі ўстанавілі, што выкрадзены аўтатранспарт зламыснік збіраўся перагнаць у Расійскую Федэрацыю.

Пасля, прыехаўшы на граніцу на адной з машын, мужчына стаў даведвацца ў людзей у чарзе, як даехаць да Смаленска. Адзін мужчына паведаміў, што пагранічнікі праводзяць пільны дагляд. Гэта спалохала зламысніка, і ён вырашыў не спрабаваць выехаць за межы краіны, паведамілі ў Фрунзенскім РУУС горада Мінска.

Усе тры аўтамабілі ў тэхнічна спраўным стане перададзены ўладальнікам.

Праводзіцца расследаванне на прадмет дачынення гэтага грамадзяніна да здзяйснення шэрагу крадзяжоў маёмасці з аўтамашын, прыпаркаваных на тэрыторыі Фрунзенскага раёна сталіцы. Вядома, што раней малады чалавек неаднаразова прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за ўгоны, крадзяжы аўтатранспарту і з яго.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«У маё жыццё прыйшло вялікае шчасце...»

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Напэўна, я магла б нарадзіць і сама, і мне хацелася мець дзяцей, але лепш, каб сям'я была поўная, у дзіцяці былі і мама, і тата. Таму ўсё і адкладвалася. Але калі мне споўнілася 40 гадоў, падумала: магчыма, не атрымаецца ўжо нарадзіць самой, нават калі ўступлю ў шлюб. Так да мяне прыйшлі думкі аб усынаўленні.

Увогуле, дзесьці год я вагалася і разважала. Размаўляла з бацькам, сястрой: мне было важна, каб яны мяне падтрымалі. Неаднаразова абмяркоўвала гэтае пытанне і з сябрамі. Тыя рэагавалі па-рознаму. Шмат хто казаў: ні ў якім разе! І расказвалі страшныя гісторыі.

Але я нічога не баялася. Страх з'явіўся пасля, калі ўжо прайшла ўсю падрыхтоўку (сур'ёзнае медыцынскае абследаванне, псіхалагічнае тэсціраванне, курсы пры сацыяльна-педагагічным цэнтры) і мела на руках дакументы, якія дазваляюць усынаўленне. Я аказалася перад выбарам — і вось тут у мяне ўзнікла самая сапраўдная паніка. А ці спраўлюся? А раптам ўпаду і нагу зламаю, як тады быць? А ці пацягну фінансава? Але ўсё ж самы вялікі страх датычыўся моманту выбару. «Як можна выбраць дзіця па каталогу, як якую-небудзь рэч?» — думала я, праглядаючы базу даных дзяцей, якія падлягалі ўсынаўленню... Слёзы наварочваліся на вочы і наварочваюцца дагэтуль, як успамінаю тыя фатаграфіі... *(Вочы Алены на самай справе сталі вільготнымі, маленькая слязінка завісла ва ўнутраным куточку левага вока, але мая суразмоўніца, відаць, яе не адчула і нават не заўважыла.)*

І я для сябе вырашыла, што не буду доўга выбіраць. Адзінае, што для мяне было рэальна важна, — у дзіцяці павінен быць такі стан здароўя, каб не давялося адмаўляцца ад працы і пазбаўляцца заробку.

«Мы зайшлі ў кватэру, і ён адразу ж упаў і заснуў, як быццам яго выключылі»

...Памятаю, мне паказвалі фатаграфіі дзяўчатак са словамі: «Хлопчыкі ж вас не цікавяць, праўда?» А мне было ўсё роўна, хлопчык ці дзяўчынка, ды і ўзрост дзіцяці быў не прынцыповым. І тады спецыяліст паказала мне анкету з размытай чорна-белай фатаграфіяй, дзе амаль нічога не было відаць. Звычайнае дзіця трох з хвосцікам гадоў: кароткія валасы, спалоханы круглы твар... Што назаўжды ўрэзалася ў памяць: яна абвяла фота хлопчыка рысачкамі, прымалявала завітушкі, кветачкі. І я тут жа, не выбіраючы больш, паехала знаёміцца.

Наша сустрэча была добра арганізаваная. Я проста прыйшла з алоўкамі і фарбамі ў групу, дзе было пяць ці шэсць дзяцей, і пагуляла з імі. Гэта была магчымасць паглядзець на хлопчыка, патрымаць яго на руках... Вельмі цяжка і страшна бачыць дзяцей, што віснуць на табе, гатовых на ўсё, абы спадабацца... Але гэты хлопчык адрозніваўся ад іх: ён слаба рэагаваў на мой прыход, быў як быццам замарожаны. Іншыя дзеці тузалі мяне, абдымалі, а ён заставаўся ўбаку. І калі я пасадзіла яго на рукі, так і сядзеў, не рухаючыся.

Калі я выйшла адтуль, адразу сказала: «Усё, я яго ўсынаўляю». Мяне нават сталі адгаворваць, прапаноўвалі прыйсці яшчэ некалькі разоў, прыгледзецца. Але я не хацела больш выбіраць, для мяне гэта было пакутліва. Па стане здароўя хлопчык падыходзіў, а больш у мяне ніякіх асаблівых крытэрыяў і не было. Мне сказалі, што ён з сям'і алкаголікаў, а калі бабуля, на якой усё трымалася, памерла, яго забралі ў прытулак. І што за сем месяцаў дзіця толькі адзін раз наведаў бацька, а маці не прыехала ні разу...

Мне ўсё ж прыйшлося з'ездзіць у прытулак яшчэ некалькі разоў, каб паглядзець, як хлопчык будзе на мяне рэагаваць, што называецца, у дынаміцы. Няня сказала яму: «Ідзі, да цябе мама прыехала!» — і ён бег да мяне па калідоры з крыкам: «Мама!»...

Адбыўся суд, пасля чаго я прывезла яго да сябе. Гэта было два гады таму, 30 красавіка. Мы зайшлі ў кватэру, і ён адразу ж упаў і заснуў, як быццам яго выключылі, — напэўна, быў эмацыянальны перагруз.

Я ўзяла на працы некалькі выхадных. Можна было ўзяць адпачынак да паўгода, па-мойму, але ён неаплатны. А мне трэба было зарабляць, ужо на дваіх.

«Я не разумела бацькоў, якія крычалі: сюды не лезь, туды не хадзі!»

...Гэта было даволі дзіўнае адчуванне: у мяне раптам з'явілася дзіця! Я прыслухоўвалася да яго соннага дыхання. Ён мог у сне дыхаць-дыхаць, а потым раптам наступала паўза, і я пужалася: што з ім? Гэта небяспечна? Ён еў усё, але пры гэтым не ведаў нічога. Памятаю, я паказала яму лімон: «Хочаш пакаштаваць?» — «Хачу!» З'еў увесь і нават не паморшчыўся. Ён не ведаў элементарных рэчаў, прыйшлося з усім знаёміць. Мне пашанцавала, што ў майго хлопчыка вельмі моцная пазнавальная актыўнасць — ён «усмоктваў» у сябе новую інфармацыю, як пыласос! Але ў нейкі момант наступаў перагруз, і тады ён тут жа адключаўся, падаў і засынаў. Першыя два тыдні я сама падала ад стомы як падкошаная.

Пазней высветлілася, што ў яго вальгусныя (дэфармаваныя. — **Аўт.**) ступні, прычым у досыць запушчаным стане: ён мог з лесвіцы ўпасці і наогул баяўся хадзіць па лесвіцах. Баяўся залезці на горку на дзіцячай пляцоўцы... Мы асвойвалі прастору вельмі павольна, пакрыху. Падняўся на адну прыступку? Малайчына! Я не разумела іншых бацькоў на дзіцячай пляцоўцы, якія крычалі: сюды не лезь, туды не хадзі! Мой палез кудысьці? Дзякуй богу! Гэта было за шчасце, мне было ў радасць, што ён рызыкнуў!

Перад тым як усынавіць дзіця, я праходзіла падрыхтоўчыя курсы, але вельмі важна атрымліваць дапамогу і пасля. Таму што ты сутыкаешся з рэальнасцю, і могуць быць рэчы, пра якія ты наогул ніколі не думала. Вельмі пашанцавала, што я знайшла таварыства ўсынавіцеляў «Родныя людзі», дакладней, мяне падключыла да яго знаёмая. Там можна задаць любое пытанне і атрымаць адказы.

У мяне былі моманты, калі здавалася, што сіл ужо проста няма. Я нават не ведаю, як гэта растлумачыць. Вось ты ўвесь час павінна быць для гэтага дзіцяці «ў наяўнасці». Калі адвернешся, яно пачынае баяцца, вісець на табе, не можа гуляць... Я знаходзіла нейкія выхады — мы разам гатавалі, разам прыборку рабілі, гулялі. Гэта быў пошук нейкага балансу, мы ўзаемна пазнавалі адно аднаго. І вельмі своечасовым быў семінар па эмацыянальным выгаранні, які ўдалося наведаць.

Праблема была і ў тым, што мой хлопчык часта не ведаў сам, што ён любіць, а чаго не. Былі складаныя моманты, калі я не магла растлумачыць, што з ім адбываецца. У самым пачатку ён зрываўся ў незразумелыя істэрыкі, прычым вельмі страшныя, якія нагадвалі воўчае выццё: адкідваўся назад і крычаў, выў нечалавечым голасам. Але я пагаварыла з псіхолагам, яна мне ўсё растлумачыла і супакоіла.

Я знайшла праз сацыяльныя сеткі яго маму, але адносін мы не падтрымліваем, і я не планую пакуль ніякіх кантактаў з ёю. Наконт будучыні сказаць не магу, будзе відаць. Яна нічога не ведае пра свайго сына — дзе ён і што з ім. Мы змянілі прозвішча дзіцяці пры ўсынаўленні, але я ад яго нічога не хаваю. Мы разам прыдумалі цэлую казку пра тое, як ён з'явіўся ў мяне. Што жылі-былі дзяўчынка і хлопчык, яго будучыя бацькі. Яны пажаніліся, і ён з'явіўся на свет. Але так здарылася, што мама з татам захварэлі і не маглі клапаціцца аб ім. Ну і гэтак далей. Мы вельмі шмат разоў яе прамаўлялі, і яна нам вельмі дапамагла.

«Ён навучыў мяне больш радавацца жыццю»

Маё жыццё вельмі змянілася. І вядома, тут вельмі важная псіхалагічная падтрымка. Таму што ёсць мноства нечаканых рэчаў, да якіх не атрымліваецца быць загадзя гатовай. Напрыклад, мой хлопчык баіцца незнаёмых дарослых. А яшчэ ён не ўмее вызначаць эмоцыі іншых людзей і ў яго шмат страхаў: што яго пакінуць, не забяруць. Мне даводзілася пастаянна прамаўляць: я іду на працу, але абавязкова ўвечары прыйду па цябе ў садок і, што б ні здарылася, абавязкова забяру.

Але ён навучыў мяне больш радавацца жыццю — і гэта самае прыемнае. Ён можа за дзень 50 разоў сказаць: «Я цябе люблю!» ці спытаць: «Ты мяне любіш?» І ён такі жыццярадасны, адкрыты, нягледзячы ні на што! Я дзякуючы яму быццам зноў акунулася ў дзяцінства: стала заўважаць, як прыгожа свеціць сонца, як кроплі падаюць, — я быццам зноўку ўсё гэта ўбачыла. А яго бясконцыя пытанні і падарункі: каштан з дарогі, лісцік або нейкую кветку знойдзе — бяжыць і дорыць мне! Гэта такая безумоўная любоў! Шкада, што дарослыя губляюць гэтае ўменне.

І здзіўляе яго здольнасць дараваць. Ён перажыў здраду самых блізкіх людзей, і не азлобіўся пры гэтым, не расчараваўся. Я шмат чаму ў яго навучылася. Першым часам прыйшлося вельмі шмат «укладваць» у яго, нічога не атрымліваючы наўзамен, ну, ці так здавалася, што нічога. А зараз мы як два сазлучаныя сасуды. А якое задавальненне бачыць, як ён расце, мяняецца, усведамляць, што ты не дарма пайшла на гэты крок!.. Так, у яго дагэтуль ёсць трывогі, ён можа прачнуцца сярод ночы і крычаць, спалохацца, калі мяне няма побач. Але, з іншага боку, ён можа ў паўсне сказаць: «Мама, я цябе вельмі люблю!» Наогул, у мяне касмічнае дзіця, трохі закрытае, але вельмі добрае, проста неверагодна!

Тыя праблемы, якія ў яго ёсць са здароўем, паступова згладжваюцца. Мы займаліся з лагапедам, і ножкі яго таксама запатрабавалі клопату і высілкаў. Але затое ён цяпер займаецца спортам, а нядаўна загарэўся вучыцца спартыўна-бальным танцам: «Мама, гэта так прыгожа!» У маё жыццё прыйшло вялікае шчасце...

Як не дайсці да знясілення...

Калі я задаю такое пытанне, Алена на хвіліну задумваецца, а потым гаворыць:

— Вельмі добра, калі на працы ведаюць і разумеюць цябе. У мяне так званае адкрытае ўсынаўленне: мае калегі ў курсе, яны мяне падтрымліваюць і, калі патрабуецца, уваходзяць у сітуацыю. І яшчэ важна знаходзіць час для сябе, не прысвячаць усё сваё жыццё цалкам дзіцяці, не злівацца з ім. Не трэба прапускаць сустрэчы з сябрамі, можна дазволіць сабе часам паглядзець фільм ці пачытаць кнігу. Я, напрыклад, яшчэ займаюся валанцёрствам: удзельнічаю ў падрыхтоўцы фестываляў лялечных батлеечных тэатраў. Мая задача — шукаць лялечныя тэатры па ўсім свеце і запрашаць іх на штогадовы Калядны фэст, які праходзіць у Свята-Елісавецінскім манастыры ў Мінску. Гэта маё захапленне. Мы ездзім з лялечнымі спектаклямі і ў дзіцячыя дамы. Хочацца даць гэтай малечы дадатковую кропельку радасці, раз я не магу ўсынавіць іх усіх. І дарэчы, да мяне ўжо прыходзяць думкі аб другім дзіцяці...

Святлана БУСЬКО.

ВОГНЕННАЯ ДРАМА НА БАРЫСАЎШЧЫНЕ

Два чалавекі загінулі ў ноч на сераду ў Барысаўскім раёне. Паведамленне аб пажары ў жылым доме ў вёсцы Навасёлкі паступіла на пульт дзяжурнага а палове на першую ночы.

Калі ратавальнікі прыбылі на месца, то аказалася, што гарыць не толькі дом, але і гаспадарчая пабудова. У пакоі дома яны знайшлі мёртвых 90-гадовую гаспадыню дома і яе 65-гадовага сына.

Прычына пажару высвятляецца.

— Пакуль яшчэ не надышлі халады, мы заклікаем усіх людзей, якія карыстаюцца пячным ацяпленнем, правесці яго агляд і пры неабходнасці рамонт, — адзначылі ў прэс-службе Мінскага абласнога ўпраўлення МНС. — Цёплае надвор'е скончыцца праз некалькі дзён, а з печчу яшчэ зімаваць. Магчымыя выдаткі не вартыя чалавечага жыцця.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Крымінал

На пяцярых — 150 кілаграмаў насваю

У сталіцы міліцыя затрымала пяцярых жыхароў Рэчыцы за рэалізацыю некурыльнага тытуню насваю.

Падчас агляду здымнай кватэры і аўтамабіля аднаго з фігурантаў аператыўнікі канфіскавалі тытунь вагой каля 150 кілаграмаў, восем электронных вагаў, тры рэспіратары. Прызначана хімічная экспертыза.

Усе маладыя людзі нідзе не працавалі і не вучыліся. Зараблялі на ўласныя патрэбы рэалізацыяй насваю на тэрыторыі сталіцы ў месцах масавага адпачынку моладзі. Узрост фігурантаў — ад 21 да 26 гадоў, паведамілі ў Фрунзенскім РУУС горада Мінска. Затрыманым пагражае пакаранне ў выглядзе адміністрацыйнага арышту. Раней некаторыя са зламыснікаў ужо неаднаразова прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці за аналагічныя правапарушэнні.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

18 КАСТРЫЧНІКА 2018 г.
ЧАЦВЕР
№ 20 (15851)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Маладыя імёны

Даніэль ЯСТРЭМСКІ:

«ЕЎРАБАЧАННЕ» — МАРА, ДА ЯКОЙ Я ДОЎГА ІШОЎ»

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ

Гэты 14-гадовы мінчанін, бадай, самы вядомы сёння беларускі дзевяцікласнік. Ён ні многа ні мала, а выйграў нацыянальны адбор на дзіцячае «Еўрабачанне» і ўжо ў лістападзе прадставіць нашу краіну на міжнародным конкурсе. А да таго перамог у рэспубліканскім конкурсе юных выканаўцаў «Маладзічок», выступаў ад Беларусі на «Дзіцячай Новай хвалі», праходзіў кастынгі ў тэлешоу «Украіна мае талент» і «Голас. Дзеці», вучыўся ў эстраднай акадэміі Ігара Крутога... Але на «зорную» хваробу ў хлопца проста няма часу — хоць і прыемна камунікаваць са шматлікімі прыхільнікамі (будзем шчырымі — прыхільніцамі), але кожны дзень у Даніэля Ястрэмскага распісаны літаральна па гадзінах: заняткі вакалам у Studio Play з педагогам Вольгай Драздовай, харэаграфія, дадатковыя ўрокі англійскай, фотасесіі, інтэрв'ю, канцэрты... І школа.

— Як ты наогул усё гэта паспяваеш?

— Пасля нацыянальнага адбору ў мяне і каманды быў тыдзень ці два адпачынку, а потым неяк адразу стала шмат спраў: дамовы на інтэрв'ю, распрацоўка новага конкурснага нумара, работа над песняй (дарэчы, мы літаральна на мінулым тыдні прадставілі канчатковую версію, яе ўжо можна паслухаць на радыё, у сацсетках і на папулярных медыясервісах — «Яндэкс.Музыка», iTunes). Які ў мяне прыкладны расклад на тыдзень? Штодня езджу на заняткі па харэаграфіі і па вакале, у выхадныя — на акцёрскае майстэрства, і яшчэ застаецца час на інтэрв'ю. Ну і, натуральна, у школу хаджу. Бывае, што нейкія дні даводзіцца прапускаць, і ўрокі я паспяваю рабіць далёка не заўжды, але настаўнікі і адміністрацыя ставяцца да гэтага з разуменнем, нават дапамагаюць і дазваляюць пэўныя паслабленні ў вучобе.

Калі я перамог на нацыянальным адборы, гэта якраз супала з пачаткам навучальнага года, і ў школе атрымаў вельмі шмат віншаванняў ад аднакласнікаў і педагогаў. Потым усё крыху сцішылася, бо я мала хадзіў на ўрокі і амаль ні з кім не меў часу пагутарыць. Але цяпер, мабыць, прызвычаіўся да такога графіка і больш актыўна камунікую з сябрамі — усе падтрымліваюць.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Старонкі гісторыі

КАЛІ НАРАДЗІЎСЯ ЛКСМБ?

У «біяграфіі» беларускага камсамола — некалькі знакавых дат

Выдавецкі дом «Звязда» па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі падрыхтаваў да выдання кнігу «У рытме імклівых гадоў. Нарысы гісторыі камсамола Беларусі», прысвечаную 100-годдзю з дня ўтварэння ВЛКСМ. На 280 старонках аўтарскі калектыў (на падставе дакументаў з дзяржаўных і асабістых архіваў) радок за радком прыгадвае вехі станаўлення і развіцця маладзёжнага руху вялікай краіны.

У пачатку выдання адзначаецца, што для Беларусі юбілейная дата важная асабліва, паколькі камсамол — равеснік сучаснай беларускай дзяржаўнасці. А далей аўтары — вядомыя вучоныя і публіцысты — працягваюць аповед пра гісторыю маладзёжнай арганізацыі... інтрыгай, пра якую, магчыма, і не кожны чытач ведае.

«Пачнём з нечаканага факта. У беларускага камсамола адразу некалькі дзён нараджэння! Як так атрымалася? Мяркуйце самі. 29 кастрычніка 1918 года — пачатак работы I Усерасійскага з'езда саюзаў працоўнай і сялянскай моладзі, легендарная дата, якую адзначаюць камсамольцы ўсіх пакаленняў і розных рэгіёнаў некалі адной вялікай краіны. Але саюзныя рэспублікі мелі і свае асаблівасці, спецыфіку, святы. Камсамол БССР таксама абзавёўся індывідуальным (калі так можна сказаць пра вялікую грамадскую арганізацыю, дзе ўсе лёсы ў адзін зліты) днём нараджэння — 24 верасня. Гэта дата звязана з I з'ездам Камуністычнага саюза моладзі Беларусі, які адбыўся ў 1920 годзе» — чытаем у выданні.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Многія і зараз захоўваюць свой камсамольскі білет як рэліквію.

«Але і гэта яшчэ не ўсё... У першыя паслярэвалюцыйныя гады беларускія камсамольцы адлічвалі пачатак свайго саюза з 15 снежня 1918 года, калі ў Мінску, вызваленым ад нямецкіх акупантаў, была заснавана гарадская арганізацыя камсамола. А ў 1990 годзе, на XII пленуме ЦК ЛКСМБ, вырашылі, што сапраўдны старт вялікаму маладзёжнаму руху быў дадзены 25 снежня, калі ў Смаленску ў тым жа 1918 годзе адкрыўся I абласны з'езд камсамольскіх арганізацый Заходняй Камуны.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

Аты-баты, ішлі дзяўчаты

«Кіраваць БМП? Не складаней, чым аўто»

Гэта і іншае — без аглядкі на пол

Ваенная справа, якая здаўна лічылася выключна мужчынскім заняткам, зараз прыцягвае і дзяўчат. У 2016 годзе на агульнавайсковы факультэт паступілі адразу дзве прадстаўніцы прыгожага полу. З адной з іх — Валерыяй ЗЫШЧЫК, якая вучыцца ўжо на трэцім курсе, і сустрэліся карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены», каб даведацца пра тое, наколькі складана насіць пагоны на жаночых плячах.

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Валерыя вучыцца па спецыяльнасці «практычная псіхалогія ў ваеннай справе». Са сваім будучым жыццёвым шляхам вызначылася яшчэ ў дзяцінстве.

— Калі мне было 11 гадоў, я пабывала ў Маскве. Там убачыла суворавцаў у форме, якія ішлі страявым крокам, і мяне гэта зачаравала. Прыехаўшы дадому ў Пінск, мы з бацькам пачалі шукаць інфармацыю. А калі мне споўнілася 12, у кадэцкім вучылішчы ў Баранавічах адкрылі набор для дзяўчат. Шэфамі ўстановы з'яўляюцца афіцэры і курсанты агульнавайсковага факультэта Ваеннай акадэміі, яны прыязджалі да нас і расказвалі пра вучобу ў сталіцы. Так і вырашыла, што трэба выбіраць прафесію, якая мне па душы і звязана з якой-небудзь сілавой структурай. Чаму псіхалогія? Гэтай сферай дзейнасці цікавілася даволі даўно. Я хачу пастаянна развівацца, удасканальваць сябе не толькі ў адным кірунку, на працягу ўсяго жыцця вучыцца, самаразвівацца, адкрываць для сябе нешта новае.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Арыенціры

РЭСУРСЫ ЎПЛЫВУ

Што фарміруе асобу маладых беларусаў

Абсалютная большасць (амаль 92 %) навучэнцаў, незалежна ад месца свайго пражывання, даведваюцца пра эканамічныя і палітычныя падзеі ў нашай краіне з інтэрнэту. Значна радзей у якасці крыніцы інфармацыі выступаюць радыё, тэлебачанне і айчынная беларуская прэса. За апошняе дзесяцігоддзе іх значнасць як інфармацыйных рэсурсаў істотна знізілася для навучэнцаў, саступіўшы месца інтэрнэт-тэхналогіям. Пра гэта сведчаць вынікі Рэспубліканскага маніторынгу асобаснага развіцця навучэнцаў, які праводзіўся падчас мінулага навучальнага года Нацыянальным інстытутам адукацыі ў адпаведнасці з міністэрскім загадам. У рамках маніторынгу вывучаліся пытанні фарміравання грамадзянскай культуры навучэнцаў 9-х і 11-х класаў: сфарміраванасць у іх грамадзянскай свядомасці, дасведчанасць у пытаннях культуры і гісторыі сваёй краіны, праяўленні патрыятызму, сацыяльна-палітычная актыўнасць і г. д. Даследаванне ахапіла 1745 навучэнцаў, 1406 бацькоў і 1070 педагогаў. З яго вынікамі можна пазнаёміцца на Нацыянальным адукацыйным партале www.adu.by ў раздзеле «Упраўленне маніторынгу якасці адукацыі».

ПРЫРОДА І СПОРТ

Як паказаў маніторынг, часцей за ўсё школьнікі цікавяцца дасягненнямі беларускіх спартсменаў (59 % рэгулярна і 33 % — зрэдку). Меншую цікавасць у іх выклікаюць дасягненні нацыянальнай культуры і палітычныя падзеі ў краіне. Прыкладна дзясятая частка рэспандэнтаў не надаюць істотнага значэння пытанням эканамічнага развіцця дзяржавы і міжнароднай палітыкі.

Крыху больш за палову апытаных адзначылі сваё добрае веданне гісторыі беларускай дзяржавы, а таксама сваю дасведчанасць адносна грамадска-палітычных падзей у краіне і за мяжой (56 % і 52 % адпаведна). Значна менш навучэнцаў арыентуецца ў пытаннях сучаснай беларускай культуры і нацыянальнай культурнай спадчыны.

Істотны ўплыў на фарміраванне грамадзянскай культуры навучэнцаў аказваюць уяўленні іх бацькоў. Так, па выніках апытання, крыху больш за палову старшакласнікаў лічаць важным веданне нацыянальнай культуры і яе развіцця і толькі каля трэцяй часткі — актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці краіны.

Каля 90 % апытаных лічаць, што галоўная каштоўнасць, якой могуць ганарыцца беларусы, — гэта наша прырода. Далей па ступені значнасці ідуць дасягненні беларускіх спартсменаў (73 % адказаў), нацыянальнае мастацтва і духоўны патэнцыял народа. Радзей у гэтым кантэксце згадваліся высокая якасць айчыннай прадукцыі, дасягненні беларускай навукі і эканамічнае развіццё краіны.

Большасць навучэнцаў лічаць, што яны многім абавязаны сваёй краіне: абсалютна з гэтым згодныя 42 % апытаных, трэць выбралі варыянт адказу «хутчэй так, чым не». Аднак каля 8 % навучэнцаў з гэтым сцвярджэннем не пагадзіліся, а 15 % не змаглі адказаць.

Каля 46 % апытаных паведамілі, што яны адчуваюць асабістую адказнасць за будучыню сваёй краіны, прыкладна столькі ж указалі варыянт адказу «ў некаторай ступені». Каля паловы апытаных (55,5 %) адназначна адказалі, што гатовы абараняць сваю Радзіму ў выпадку пагрозы, і 27,5 % выбралі адказ «хутчэй так».

ДЛЯ КАГО МОВА РОДНАЯ?

Прадметам вывучэння сталі таксама прыярытэты падлеткаў у сферы спажывання, адукацыі і адпачынку. Маніторынг паказаў, што большая частка навучэнцаў арыентаваная на замежную культурную і прамысловую прадукцыю. Каля траціны апытаных адказалі, што яны адназначна аддаюць перавагу замежнай музыцы і кінематографу, і амаль 47 % схіляюцца да такога выбару. У якасці месца для адпачынку і турызму 30 % адназначна выбралі б паездку за мяжу і каля 37 % схіляюцца да гэтага варыянта.

Істотным фактарам фарміравання патрыятычных каштоўнасцяў і адначасова іх непасрэдным пацвярджэннем у паўсядзённым жыцці выступаюць такія практыкі, як дэкаратыўна-прыкладная творчасць, гатаванне страў нацыянальнай кухні, актыўнае выкарыстанне беларускай мовы, нацыянальных элементаў у адзенні, быце і г. д. З усяго вышэйпералічанага найбольш распаўсюджаным элементам беларускай нацыянальнай культуры, якому знаходзіцца месца ў жыцці сучасных старшакласнікаў, з'яўляюцца нацыянальныя стравы: дадзены варыянт адказу адзначылі 71 % апытаных.

Прыкладна чвэрць навучэнцаў адзначылі, што яны выкарыстоўваюць беларускую мову ў штодзённых стасунках (у сельскай мясцовасці — 36,4 %), нацыянальныя элементы — у адзенні, інтэр'еры... Пры гэтым лічаць беларускую мову роднай 75,4 % навучэнцаў сельскіх устаноў адукацыі і 57,5 % — гарадскіх. Каля 20 % апытаных указалі, што ў вольны час займаюцца дэкаратыўна-прыкладной творчасцю, народнымі рамёствамі, выконваюць народныя песні.

ВЫХАВАННЕ НА ТРАДЫЦЫЯХ

Важным фактарам фарміравання ў школьнікаў патрыятызму і грамадзянскасці з'яўляюцца сямейныя традыцыі, у прыватнасці святкаванне тых ці іншых знамянальных дат. Новы год і Вялікдзень адзначаюцца практычна ва ўсіх сем'ях. Большасць рэспандэнтаў указалі, што ў іх сем'ях святкуюць Дзень Перамогі, Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Адзначаецца таксама Радуніца. Каля паловы апытаных паведамілі, што яны адзначаюць Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і свята Івана Купалы.

На пытанне аб тым, што яны асабіста робяць, каб выхаваць у свайго дзіцяці грамадзянскасць і патрыятызм, большасць апытаных бацькоў адказалі, што навучаюць беражліваму стаўленню да навакольнага асяроддзя (71,3 %). Прыкладна столькі ж расказваюць сваім дзецям пра гісторыю сям'і, яе радаслоўную. Каля 60 % указалі, што яны вучаць нераўнадушнаму стаўленню да патрэб іншых людзей. Многія бацькі здзяйсняюць са сваімі дзецьмі экскурсіі па культурна-гістарычных мясцінах Беларусі, глядзяць разам фільмы патрыятычнага зместу, акцэнтуюць увагу на тым, чым могуць ганарыцца беларусы, захоўваюць нацыянальныя традыцыі (40—46 % бацькоў). Крыху менш тых, хто рэкамендуе сваім дзецям для чытання літаратурныя творы па гісторыі Беларусі, пра нацыянальных герояў Вялікай Айчыннай вайны, наведваюць разам з дзіцем выстаўкі, спектаклі, канцэрты, якія фарміруюць патрыятычныя пачуцці, прывіваюць любоў да нацыянальнай культуры, мовы, літаратуры, мастацтва (23—31 %).

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ПРАЦА І ГОДНЫ ЗАРОБАК

Па звестках даследавання, 56 % навучэнцаў цалкам згодныя са сцвярджэннем, што праца з'яўляецца для чалавека спосабам самарэалізацыі. Большасць апытаных схільны пагадзіцца з тым, што атрымаць не зароблены сваёй працай грошы — зневажальна (44 % адказалі «так, згодны» і 25 % — «хутчэй так, чым не». Пры гэтым далёка не ўсе ўпэўненыя ў тым, што праца заўсёды павінна быць на першым месцы. А многія лічаць, што не варта прымушаць людзей працаваць, калі яны гэтага не хочуць.

Каля 40 % навучэнцаў лічаць, што ўсе праблемы, якія датычацца жыцця людзей у грамадстве, павінна вырашаць дзяржава, а амаль 15 % у гэтым абсалютна ўпэўненыя.

Трэцяя частка апытаных указалі, што стаўленне да краіны, у якой яны жывуць, вызначаюць у першую чаргу перспектывы ўладкавання свайго жыцця і эканамічнага развіцця. А 13 % старшакласнікаў у якасці такога фактару ўказалі ўзровень матэрыяльнага дабрабыту сваёй сям'і. Аднак для большасці апытаных (ва ўсялякім разе на дэкларатыўным узроўні) вызначальнымі з'яўляюцца прывязанасць да родных мясцін, блізкіх людзей, культура, менталітэт народа, а таксама любоў да радзімы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Разумнікі і разумніцы

Паказалі не «батанскі» клас!

У пачатку кастрычніка ў Стамбуле (Турцыя) праходзіў міжнародны конкурс навуковых работ International Science project Olympiad, INSPO 2018. Беларускія школьнікі ўдзельнічалі ў ім упершыню і прывезлі дадому высокія ўзнагароды — «серабро» і «бронзу».

INSPO з'яўляецца найбуйнейшым у рэгіёне форумам маладых вучоных, які праводзіцца з 2007 года пад патранатам міністэрства адукацыі Турцыі. З 2014 года INSPO набыў міжнародны статус. Сёлета конкурс аб'яднаў 26 краін-удзельніц, на ім было прадстаўлена 68 праектаў з больш чым 200, адабраных па выніках папярэдняй экспертызы членамі журы з ліку міжнародных экспертаў.

Абарона праектаў праходзіла ў чатырох секцыях: «Здароўе», «Інжынірынг», «Навакольнае асяроддзе» і «Энергія». Па ўмовах конкурсу прадстаўленая даследчая работа павінна быць выканана ўдзельнікамі самастойна, быць цалкам завершанай і мець практычную значнасць.

Навучэнцы аб'яднання па інтарэсах «Батаніка і прыкладная біялогія» Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства Уладзіслаў Андрайчук і Паліна Кракасевіч выконвалі свае навуковыя даследаванні пад кіраўніцтвам педагога дадатковай адукацыі Алесі Аляксандраўны Шавялёвай у перыяд з верасня 2016 года па май гэтага года.

Навучэнцы прэзентавалі свае праекты ў двух фарматах: у выглядзе стэндавай абароны з загадзя падрыхтаваным дакладам і ў гутарцы з членамі журы. У ходзе прэзентацый тыя маглі задаваць любыя пытанні па тэме даследавання. Паколькі рабочай мовай конкурсу з'яўляецца англійская, ад удзельнікаў патрабавалася не толькі глыбокае валоданне прадметам даследавання, але і выдатнае веданне прафільнай лексікі англійскай мовы.

Акрамя прэзентацыі ўласных праектаў, беларускія школьнікі атрымалі ўнікальную магчымасць пазнаёміцца з навуковымі работамі навучэнцаў з іншых краін, пагутарыць з навукоўцамі-эколагамі і аднагодкамі ў нефармальнай абстаноўцы, абмяняцца ідэямі, а на Дні культур паказаць народныя традыцыі Беларусі, пачаставаць усіх удзельнікаў конкурсу стравамі нацыянальнай кухні.

Па выніках прадстаўлення навуковых работ Уладзіслаў Андрайчук быў адзначаны сярэбраным медалём у секцыі «Інжынірынг» за свой праект «Аэрафільная водарасць Trentepohlia Umbrina Kutz як новы перспектыўны біятэхналагічны аб'ект», а Паліна Кракасевіч — бронзавым медалём у секцыі «Здароўе» за праект «Ацэнка антыфунгальных і кансервавальных уласцівасцяў міцэлію базідыяміцэтаў у працэсе вытворчасці касметыкі».

Акрамя гэтага, Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства атрымаў магчымасць стаць афіляванай арганізацыяй конкурсу. Гэта азначае, што ў далейшым два праекты, выкананыя пад кіраўніцтвам педагогаў цэнтра, будуць дапушчаныя да ўдзелу ў конкурсе без папярэдняга ацэньвання.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Погляд праз час

ПРАШУ ПРЫНЯЦЬ МЯНЕ Ў РАДЫ...

— А не спалохаешся цяжкасцяў? Усё зробіш, што будуць патрабаваць ад цябе камсамол, бальшавіцкая партыя? Ты ж ведаеш, Алёша, мы ныцікаў не любім...

Гэтыя словы пачуў работнік калгаса «Іскра Леніна» Віцебскага раёна, калі яго прымалі ў камсамол. Пра яго ўражанні расказвала «Чырвонка» ў 1948 годзе. Наогул, калі гартаеш старыя падшыўкі, атрымліваеш уяўленне не толькі пра справы маладзёжнай арганізацыі, але і пра стаўленне да яе хлопцаў і дзяўчат. «Буду з чэсцю насіць імя члена ВЛКСМ», «абяцаю быць дастойным» — усё гэта не было ў той час проста фармальнымі, прыгожымі словамі. Многія верылі, што званне камсамольца яшчэ трэба заслужыць, маўляў, пакуль нечым не вызначыліся, не сталі стаханаўцам, у арганізацыю ўступаць рана.

* * *

«Калі хочаш хутчэй асвоіць сваю прафесію, прыглядайся, як працуюць комсамольцы», — гаварылі ў той час маладым. На кожным прадпрыемстве ладзіліся спаборніцтвы паміж брыгадамі, і менавіта работнікі з камсамольскімі білетамі датэрмінова выконвалі планы пяцігодак, давалі двайныя нормы, змагаліся за прадукцыйнасць працы.

«Камсамольцы ідуць у першых радах змагароў за хутчэйшае аднаўленне і далейшае развіццё народнай гаспадаркі. Тысячы камсамольцаў сталі на рыштаванні пасля ваеннай сталінскай пяцігодкі. Звыш 30 тысяч юнакоў і дзяўчат самааддана працуюць на новабудоўлях, удзельнічаюць у аднаўленні гарадоў. З іх пяць тысяч чалавек па пуцёўках камсамола будуюць у Мінску трактарны і аўтамабільны заводы. Пры актыўным удзеле камсамольцаў з руін і папялішчаў уздымаецца сталіца нашай рэспублікі», — рапартавала «Чырвонка» напярэдадні 30-годдзя ВЛКСМ. Адно з абавязацельстваў, якія ў гэты час бяруць на сябе маладыя актывісты, — завяршыць будаўніцтва дамоў для сем'яў, што жывуць у зямлянках і на падсяленні. Камсамольскія арганізацыі прадпрыемстваў накіроўваюць у калгасы свае маладзёжныя рабочыя брыгады. У многіх вёсках хлопцы і дзяўчаты задзейнічаны на будаўніцтве электрастанцый. Камсамольцы будуюць клубы, дамы культуры, закладваюць сады.

* * *

Прадукцыя звыш планаў, праца ў пазаўрочны час, барацьба за ўраджай кукурузы — гэта ўсё пра камсамол Беларусі ў 50—70-я гады. «126 дзён існуе наша будоўля. 7 чэрвеня пад Полацкам на крутым беразе Заходняй Дзвіны забіты першыя калочкі будучага горада беларускіх нафтабудавікоў. І вось за гэты невялікі тэрмін вырас першы піянерны квартал жылых дамоў-інтэрнатаў», — чытаю ў нумары «ЧЗ» за 12 кастрычніка 1958 года. Так, камсамольцы ўзводзілі не толькі прамысловыя аб'екты «Нафтабуда», яны стваралі інфраструктуру, дзякуючы ім у чыстым полі выраставалі жылыя кварталы, школы, сады, бальніцы.

Горад шахцёраў таксама ствараўся маладымі, прычым на будоўлю і Салігорска, і Наваполацка прыязджалі камсамольцы з усяго Саюза. У сваю чаргу беларускія хлопцы і дзяўчаты выбіраліся на будоўлю Маскоўскага метрапалітэна, Камсамольска-на-Амуры, Байкала-Амурскай магістралі, пакаралі цаліну ў Казахстане, праводзілі меліярацыю ў Пскоўскай вобласці.

«Заклік партыі: «Сёння працаваць лепш, чым учора, заўтра лепш, чым сёння» — вызначае цяпер сутнасць дзейнасці кожнай камсамольскай арганізацыі», — пісала «Чырвоная змена». І сапраўды, камсамол натхняў на працоўныя подзвігі. Нярэдкія былі выпадкі, калі на прадпрыемствах асобныя брыгады, якія раней не спраўляліся з планамі, перакідвалі на ўчасткі, дзе працуюць перадавікі-камсамольцы. І «адстаючыя», каб уцерці нос «стаханаўцам», уключаліся ў спаборніцтвы і паказвалі годныя вынікі.

* * *

Моладзь адгукаецца на ўсе буйныя падзеі і мерапрыемствы, што адбываюцца ў краіне, ладзіць камсамольскія суботнікі, удзяляе ўвагу навукова-тэхнічнай рабоце, прычым укараненні рацыяналізатарскіх прапаноў камсамольцаў даюць добры эканамічны эфект.

1978 год. Паспяхова завершаны самы працяглы на той час пілатаваны палёт, у якім удзельнічаў беларус Уладзімір Кавалёнак. Каб падтрымаць гэтую перамогу ў космасе, моладзь вёскі Белае Крупскага раёна, што на радзіме славутага земляка, стварае «Клуб юных касманаўтаў».

Ужо ў канцы 60-х адсяляюцца хутары і ідзе ўзбуйненне вёсак, а ў 70-я многія з іх наогул набываюць новае аблічча. Моладзь задзейнічана ў гэтых працэсах. «У Беларусі пачалося інтэнсіўнае будаўніцтва ўзбуйненых сельскіх населеных пунктаў, якія па характару працы іх жыхароў і сацыяльных выгодах для іх не ўступяць гораду», — расказвае «ЧЗ» у лістападзе 1978 года пра будоўлю ў палескім саўгасе «Малеч». Усе работы вядуцца па эксперыментальным праекце. Тут з'явіліся механізаваная малочнатаварная ферма, свінагадоўчы комплекс, тэхнічныя майстэрні. Вуліца забудаваная двух- і трохпавярховымі катэджамі з кватэрамі з усімі выгодамі. Запрацавалі новая школа, Дом культуры, сталовая, гасцініца, камбінат бытавога абслугоўвання, у які, акрамя ўсяго іншага, уваходзяць швейнае атэлье і пункт пракату бытавой тэхнікі.

* * *

У 80-я гады пад эгідай камсамола ствараюцца кааператывы і арганізацыя спрабуе кіраваць моладдзю, якая вучыцца «рабіць грошы». Напрыклад, у Гродне арганізаваны спецыяльны культурны цэнтр, які займаецца стварэннем гаспадарча-разліковых маладзёжных аб'яднанняў, якімі часта кіруюць выхадцы з камсамола. Ужо ў 1988 годзе ў горадзе працуе тры дзясяткі маладзёжных кавярняў, у мясцовым відэаклубе пачынаюць паказваць замежныя фільмы. Праўда напачатку, баючыся негатыўнага ўплыву «заморскай» прадукцыі, «рэпертуар зацвярджаецца кампетэнтнай камісіяй».

Але ў гады перабудовы стаўленне да камсамола мяняецца. «Сёння мы гаворым пра крызіс у камсамоле, пра дэфіцыт даверу моладзі, — заяўляе праз старонкі газеты першы сакратар Магілёўскага абкама камсамола В. Чаканаў. — Цяпер нікога не выведзеш на працу пад лозунгам. Кожная ідэя, прапанаваная намі, патрабуе расшыфроўкі: у імя чаго яна. Галоўнае для камсамольскіх работнікаў цяпер не слова, а сацыяльна значымая справа». Саюз моладзі спрабуе шукаць новыя шляхі работы, да яго далучаюцца воіны-інтэрнацыяналісты, па тэрыторыі ўсяго СССР ствараюцца палітычныя клубы, у тым ліку і ў Беларусі. Але нараджаюцца новыя арганізацыі і паўстае пытанне аб далейшай ролі камсамола, яго манаполіі ў кіраванні маладзёжным рухам...

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

КАЛІ НАРАДЗІЎСЯ ЛКСМБ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Зрэшты, аб усім па парадку... Ужо першае пакаленне камсамольцаў з гонарам прызнавала, што ў справе аб'яднання маладых людзей яны не першапраходцы. ЦК камсамола Беларусі, адзначаючы пяцігоддзе сваёй арганізацыі, канстатаваў: «Ёсць у нас свае папярэднікі — гэта тыя падлеткі, юнакі, якія ў гады да рэвалюцыі былі ўдзельнікамі сутычак, дэманстрацый, гэта тыя падлеткі, гэта тыя юнакі, якія складалі першыя юнацкія арганізацыі ў нашым краі». Але традыцыі маладзёжнага руху ў нашай краіне яшчэ больш даўнія. Розныя маладзёжныя вучнёўскія і студэнцкія арганізацыі ствараліся ў сценах Полацкага калегіума, Віленскага ўніверсітэта, Горы-Горацкага земляробчага інстытута, кадэцкіх карпусоў, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі...»

Пасля грамадзянскай вайны — ліквідацыя непісьменнасці, будоўлі першых пяцігодак... Гераічная барацьба камсамольцаў у гады Вялікай Айчыннай вайны... Пасля Перамогі яны змянілі вінтоўкі і кулямёты на кельмы і рыдлёўкі: пачалося аднаўленне мірнага жыцця... Ударныя маладзёжныя будоўлі, засваенне цаліны, студэнцкія атрады,

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Узнагароды маладзёжнай арганізацыі заўсёды лічыліся пачэснымі.

БАМ... Хваля бурных перамен 1980—1990 гадоў... На змену савецкаму камсамолу прыходзіць Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, які падхапіў і прадоўжыў найлепшыя традыцыі з мінулага сваіх папярэднікаў...

Упершыню за больш чым трыццаць гадоў калектыў аўтараў вырашыў прааналізаваць той шлях, які прайшла вядучая маладзёжная арганізацыя. Большасць з іх маюць уласны вопыт працы ў камсамоле ці БРСМ. «Хутчэй за ўсё, гэта толькі пачатак вялікай работы па асэнсаванні і аналізе гісторыі маладзёжнага руху ў нашай краіне. Напярадзе яшчэ не адна публікацыя і кніга» — абяцаюць аўтары калектыўнага выдання.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Голас памяці

СТАРТЫ НАДЗЕЙ НАШАГА ЮНАЦТВА

Я добра памятаю той снежны, з завірухай, марозны лютаўскі дзень у 1960 годзе, калі ўступіў у ВЛКСМ. Жаданне стаць камсамольцам было вялікае.

Я тады вучыўся ў восьмым класе Коленскай сярэдняй школы Жыткавіцкага раёна, мне было 15 гадоў. Нам з сябрам-аднакласнікам камітэт камсамола школы даў рэкамендацыю для ўступлення ў рады ВЛКСМ. І вось мы, зусім юныя вясковыя хлопцы, у сцюжу, завіруху амаль па снежным бездарожжы паехалі на веласіпедах — грамадскі транспарт амаль не хадзіў — за 15 кіламетраў у Жыткавіцкі райкам камсамола. І зараз памятаю, як яго першы сакратар запыталася ў нас, як мы вучымся і паводзім сябе, які ўдзел прымаем у грамадскай рабоце і жыцці школы, якія маем даручэнні. Нас прынялі, і якая была радасць, што мы сталі камсамольцамі. І зараз захоўваю камсамольскі білет і значок як памяць аб тых часах.

Добра памятаю, як з вялікім жаданнем піянеры і камсамольцы школы, у тым ліку і я, удзельнічалі ў ваенна-спартыўных гульнях «Зарніца» і «Арляня», начавалі ў палатках, спявалі песні каля вогнішча. Прымалі ўдзел у спартландыях і «Стартах надзей», выконвалі нарматывы на значок «Гатовы да працы і абароны». Дапамагалі роднаму калгасу ва ўборцы ўраджаю. Праводзілі многа іншых цікавых мерапрыемстваў.

Лічу, што знаходжанне ў камсамоле для мяне, як і для многіх юнакоў і дзяўчат тых гадоў, было толькі станоўчым. Я аб гэтым не шкадую. Не дзеля карысці я калісьці быў камсамольцам. А яшчэ ён для мяне — гэта мая маладосць, маё першае каханне, мае школьныя і студэнцкія гады, падчас якіх я сустрэў сяброў, гэта росквіт краіны... Усё сказанае вышэй — гэта старонкі гісторыі камсамола і былой вялікай дзяржавы, і іх трэба памятаць і паважаць.

Уладзімір Міхайлавіч РУДЗІНСКІ, *г. Гомель.*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
18 10 2018 г.

З ранняга дзяцінства яна хацела стаць артысткай і вось цяпер лунае пад купалам цырка... Анастасія ДОНЧАНКА вучыцца на чацвёртым курсе завочнага аддзялення Віцебскага дзяржаўнага каледжа культуры і мастацтваў на рэжысёра абрадаў і свят, не любіць гаварыць пра няўдачы і не ўяўляе жыцця без сваёй працы.

Свой выбар

ПАД КУПАЛАМ МАРЫ

— У дзяцінстве вы пачыналі з гімнастыкі...

— У яе прывяла мама. Я была зусім маленькая, гады чатыры. Але з гімнастыкай у мяне не склалася. Я была вельмі жвавым дзіцем, мне хацелася дзесьці павісець, нешта зрабіць экстрэмальнае. У адзін дзень ціхенька ўцякла на кольцы, пакуль гэтага не бачыла трэнер, але, на жаль, стукнулася, пайшла кроў з носа. На мяне, вядома, насварыліся, расказалі ўсё маме. І я адмовілася прыходзіць на трэніроўкі.

Затым былі танцы і нават тэквандо, але і з гэтым не склалася. А вось у цыркавой студыі было куды цікавей. Вядома ж, я зрабіла ўсё магчымае, каб застацца ў ёй, і займалася да самага свайго паўналецця. Дарэчы, бабуля жартам называла мяне цыркачкай яшчэ з дзяцінства. Як бачыце, мела рацыю. *(Смяецца.)*

— І як развівалася цыркавая кар'ера?

— Вядома ж, не адразу, бо такіх артыстаў дагэтуль у нашай сям'і не было. Прыгадваю шматлікія трэніроўкі, часам даводзілася нешта вучыць і самой: калектыў складаўся з сарака-пяцідзесяці дзяцей і толькі аднаго трэнера і харэографа. Я назірала за гімнасткамі, глядзела відэа... У 12 гадоў ужо на сто працэнтаў ведала, кім стану ў будучыні і дзе хачу працаваць. У 16 гадоў цудоўным чынам трапіла ў цырк Дар'і Касцюк. Вось там і пачалася мая цыркавая кар'ера. Былі змешаныя эмоцыі. Напрыклад, трэба было вывучыць нумар за пару дзён, даводзілася стараннa працаваць.

Затым скончыла адзінаццаты клас і паступіла. Год вочнага навучання быў вельмі напружаны. У Віцебску няма цыркавых калектываў, і было цяжка трымаць сябе ў тонусе. Праз год я перавялася на завочнае аддзяленне. За месяц да гэтага мяне запрасілі паспрабаваць сябе ў выдатны калектыў «Беларускія наезнікі на конях» пад кіраўніцтвам Барыса Лазарава. Мне пашанцавала папрацаваць з заслужаным артыстам Асеціі і яго сям'ёй. Вялікі ўклад у маё развіццё зрабіла Ала Анатольеўна Нікалаева-Аліева, галоўны рэжысёр Беларускага дзяржаўнага цырка. Дзякуючы гэтаму чалавеку я выступіла ў Александрыі ў эстрадна-цыркавой праграме «Купальскі сон», прыняла ўдзел у пралогу першага Мінскага міжнароднага фестывалю цыркавога мастацтва, у праграмах «Навагодняя казка ў цырку» і «Цырк! Цырк! Цырк!». Але, самае галоўнае, мне выпаў гонар прадставіць нашу краіну на цыркавым фестывалі ў Рызе, дзе з напарніцай Анастасіяй Пуцятай у якасці паветраных гімнастак мы занялі другое месца.

— Напэўна, пастаянна даводзіцца рэпеціраваць? Колькі часу патрабуецца для падрыхтоўкі новага нумара?

— Я ніколі не ўстанаўліваю сабе нейкіх рамак. Магу рэпеціраваць ад гадзіны да трох, схадзіць на харэаграфію, у трэнажорную залу. У цырку для гэтага ёсць усе ўмовы. А што датычыцца часу на падрыхтоўку новага нумара... Тут усё па-рознаму: можа спатрэбіцца два тыдні, а можа месяц і нават год. Гэта залежыць ад многіх фактараў: фізічнай падрыхтоўкі, складанасці нумара, яго задумкі. Дарэчы, для мяне самым небяспечным і складаным нумарам застаецца паветраная трапецыя.

— А як жа нумары з удзелам жывёл?

— У праграме «Навагодняя казка ў цырку» працавала з вярблюдамі і ламамі. Дарэчы, заўсёды любіла пакарміць жывёл, даць ім пабольш сухарыкаў, пагладзіць. У нейкі момант гэта магло пайсці не на карысць справе. *(Смяецца.)*

— Цырк для вас — гэта...

— Я заўсёды аддавала ўсю сябе цыркавому мастацтву. Дзякуючы яму я — творчы чалавек, вучуся на рэжысёра і дапамагаю трэніраваць дзетак у цыркавой студыі. Зараз абсалютна ўпэўнена вам кажу, што ўявіць сваё жыццё без яго не магу!

Ангеліна НОВІКАВА, студэнтка II курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

«Кіраваць БМП? Не складаней, чым аўто»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Наколькі складана было паступіць у кадэцкае вучылішча?

— Меркавалася ўзяць толькі дзвюх дзяўчат, а заяў было значна болей. Шмат адсеялася на псіхалагічным

Каб трапіць у трэнажор баявой машыны пяхоты, трэба быць спрытным.

адборы і на фізкультуры. А я ж прафесійна займалася танцамі, баскетболам, лёгкай атлетыкай. Праблем з фізічнай падрыхтоўкай не было, і таму прайшла па конкурсе. У кадэцкім вучылішчы я правучылася чатыры гады. Акцэнту на тым, што я дзяўчына, не было. Праграма была агульная для ўсіх. А калі паступала ў Ваенную акадэмію, то падрыхтавала запасны варыянт. Калі б не ўдалося трапіць па конкурсе сюды, то пайшла б вучыцца ў БДУ на псіхолага.

— Але ўсё атрымалася!?

— Так. Мне раілі Акадэмію МУС, Камандна-інжынерны інстытут МНС. Але па розных прычынах я гэтыя варыянты не разглядала. Пашанцавала, што калі выпускалася з кадэцкіх шэрагаў, то ў Ваеннай акадэміі адкрылі набор псіхолагаў-дзяўчат. Таму я, можна сказаць, першапраходзец. Лічыце, са 105 курсантаў, 14 з якіх — псіхолагі, дзяўчыны ўсяго дзве. Працэс адаптацыі прайшоў дастаткова хутка. Я не разумела спачатку спецыфіку навучання, бо ў кадэцкім вучылішчы ўсё інакш, па-іншаму расстаўлена кіраўніцтва. Але даволі хутка ўцягнулася. Цікава, што ў нас вучыцца дзесяць чалавек з Пінска, але да сустрэчы ў Акадэміі ніхто адно аднаго не ведаў!

— А калі б склалася інакш і давялося ісці ў грамадзянскую ВНУ...

— Так, часам я ўяўляю звычайнае жыццё сярэднестатыстычнага студэнта з яго разняволенасцю. Але кім бы я там была? Я ўсё ж такі дастаткова рана ўцягнулася ў ваенную падрыхтоўку. І нават калі гляджу на сваіх аднагодкаў, гутару з сябрамі, то адчуваю пэўную сталасць. Вайсковае жыццё дысцыплінуе, і гэта цудоўна. А на грамадзянцы так многа спакус і ляноты...

— Які твой распарадак дня?

— Прачынаюся ў 5.30. Зарадка пачынаецца ў 6.15. Для гэтага трэба прыйсці на тэрыторыю Акадэміі, паколькі мы жывём у інтэрнаце паза яе межамі. Калі вяртаемся, то ў нас усяго 20 хвілін, каб пераапрануцца і ісці на ранішні агляд і на сняданак. Як правіла, у дзень — чатыры пары, з 8.30 да 14.40. Пасля абед і самападрыхтоўка з 16.00 да 19.30. І толькі пасля вячэры я вяртаюся назад у інтэрнат...

— А ў выхадныя?

— Субота ў нас — звычайны навучальны дзень. Заняткі ідуць да абеду, пасля яго ў інтэрнаце пачынаецца парка-гаспадарчы дзень, як і ў войску. Затым вячэра і назад. У нядзелю пад'ём а сёмай гадзіне. Пасля сняданку глядзім праграму «Арсенал», займаемся спортам і з гадзіны дня наступае вольны час.

Бываюць, праўда, тыдні, калі крыху стамляешся і фізічна, і маральна. Але гэта праходзіць. Дастаткова толькі з'ездзіць у звальненне, балазе з вучобай у мяне праблем няма. Як і ў звычайным жыцці, проста трэба на некаторы час змяніць абстаноўку. Ды і адпачынак пасля кожнай сесіі дапамагае. Узімку ён доўжыцца 12 сутак, а ўлетку — цэлы месяц.

— З чаго складаецца навучальны працэс?

— Ён у нас агульны як для хлопцаў, так і для дзяўчат. Праграма ўключае прадметы па псіхалогіі — асобаснай, ваеннай, узроставай, педагагічнай. Прычым элемент псіхалогіі ёсць ужо непасрэдна ў моманце знаходжання



Паркава-гаспадарчы дзень — усё, як і ў звычайнай часці.

Ваенная форма і прыгажосць — сумяшчальныя!

ў замкнёным калектыве. Так і выпрабоўваем адно на адным метады візуальнага назірання, якім нас вучаць. І канешне ж, ёсць дысцыпліны, без якіх не можа абысціся кожны афіцэр, — тактыка, баявая падрыхтоўка, агульнавайсковы статут, страявая падрыхтоўка, ваенна-інжынерная, будова і эксплуатацыя бранятанкавай тэхнікі, кіраванне падраздзяленнямі ў мірны час. Зараз мы нават вучымся кіраваць баявой машынай пяхоты (БМП). На першы погляд падаецца, што гэта вельмі складана. І спачатку нават крыху баішся. Але аказваецца, што гэта прасцей, чым кіраваць звычайным аўтамабілем.

На першым курсе мы шмат бегалі на спартыўнай падрыхтоўцы. Марш-кідкі на 10 кіламетраў былі звычайнай справай. Выкладчык па фізкультуры вучыў нас сакрэтам рукапашнага бою. Ён быў дастаткова патрабавальны. Яшчэ мы вучыліся па бразільскай сістэме — гэта калі ўсе практыкаванні робяцца адразу цэлай камандай. У выніку для мяне прабегчы 10 кіламетраў усё роўна, як цывільнаму чалавеку прайсціся ў прадуктовую краму.

— Тэорыя псіхалогіі павінна падмацоўвацца практыкай...

— Стажыроўка будзе пасля трэцяга курса — усяго адзін раз на чатыры гады. Мы выязджаем на месяц у злучэнні, дзе працуем непасрэдна з салдатамі і афіцэрамі. Справа ў тым, што ў псіхалагаў ва Узброеных Сілах толькі адна пасада — псіхолаг батальёна.

— Што самае галоўнае ты вынесла за час вучобы?

— Тое, што ніколі не трэба здавацца. Як бы цяжка ні было, але пасаваць перад складанасцямі нельга ні ў якім разе. Заўсёды можна знайсці рашэнне, прыняць яго і выканаць. Так, ёсць пераломныя моманты, але іх трэба проста перажыць. Пачытаў кнігу, пагуляў у баскетбол, валейбол — і ўсё бачыцца ўжо не такім сумным.

Валяр'ян ШКЛЕННІК. Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Пасябраваць з Музай

КАЛІ ГІСТОРЫІ — З ЖЫЦЦЯ

ІХ БУДУЦЬ ЧЫТАЦЬ НАВАТ У ЯПОНІІ

Мінская дзевяцікласніца Сафія ВОРСА пакуль не прывыкла, што яе называюць пісьменніцай. Але талент дзяўчыны ўжо ацанілі не толькі ў нашай краіне. На міжнародным літаратурным конкурсе «Новыя імёны» ў Балгарыі яна стала пераможцай у намінацыі «Эсэ», абышоўшы 500 канкурсантаў.

Сафія вучыцца ў сталічнай гімназіі № 4. Апавяданні прыдумляе з дзяцінства. Першымі творамі сталі казкі для малодшай сястры. «Яны былі доўгія і нудныя і ёй не падабаліся, — з усмешкай успамінае дзяўчына. — Але я любіла іх складаць. Гэта былі гісторыі пра насякомых і жывёл».

Чаму школьніца стала пісьменніцай? Вельмі шмат ідэй у галаве, тлумачыць Сафія. План будучых апавяданняў яна не складае: словы надыктоўвае ўнутраны голас. Будучыя творы дзяўчына занатоўвае на паперы або ў тэлефоне.

— Апавяданне часам пішу за 30 хвілін: думкі апярэджваюць рух рукі. Потым складана гэта ўсё расшыфроўваць, — смяецца. — А бывае, ёсць грандыёзная ідэя, але няма часу, і ты два тыдні над ёй працуеш — па некалькі хвілін у дзень.

Каб трэніраваць свой навык, Сафія шмат чытае. Больш за ўсё яна любіць гістарычныя раманы і фантастыку. Напрыклад, пра прыгоды караля Артура і чараўніка Мэрліна. З пісьменнікаў падабаецца Марк Твэн.

Таксама Сафія наведвае лекцыі па літаратуры і гурток пры Нацыянальнай бібліятэцы для... маленькіх дзяцей. «Там цікава! — запэўнівае. — Мой стрыечны брат туды хадзіў, і я папрасілася. Нам расказваюць пра пісьменнікаў, гісторыі стварэння кніг».

Школьніцу натхняе прырода, людзі, якія побач, поспехі іншых. Характары большасці сваіх герояў яна спісвае са знаёмых. У апавяданні «Аргалон», якое стала найлепшым на конкурсе ў Балгарыі, расказваецца пра ўзаемаадносіны паміж братамі і сёстрамі. Дзяўчына не хавае: у аснову твора паклала жыццё ўласнай сям'і.

Першы літаратурны конкурс у жыцці дзяўчыны адбыўся два гады таму. Яго праводзіў часопіс «Роднае слова». Пасля гэтага ўсё і закруцілася: дыпломы на розных міжнародных конкурсах, публікацыі ў Літве, Польшчы, Расіі... Рэдакцыя часопіса дапамагла школьніцы выдаць яе першую кнігу — «Дзесяць простых гісторый». На прэзентацыі тых апавяданняў апынуўся лінгвіст з Японіі, якому яны спадабаліся. Ён сказаў, што сюжэты вельмі падобныя да жыцця дзяцей у яго краіне, і прапанаваў перакласці кнігу на японскую.

Крытыку ў свой адрас юная творца чула рэдка.

— Вядома, калі гэта нешта канструктыўнае — раяць, што тут слова можна было замяніць ці павярнуць інакш сюжэт, — я прыслухваюся.

Бацькі пачынанні дачкі толькі падтрымліваюць. І наогул не абмяжоўваюць праяўленні творчасці. «Сцены — размалёўвай, музыку ў 12 ночы — іграй», — жартуе дзяўчына.

Дзіўна, але ў школьніцы не гуманітарны склад розуму. Мовы ёй даюцца складана. Нашмат лепш «заходзяць» фізіка і матэматыка, і сваю будучую прафесію Сафія хацела б звязаць з гэтымі прадметамі. Не, думае стаць не праграмістам — астраномам. А літаратуру пакінуць як хобі.

Сярод іншых захапленняў — ігра на сінтэзатары і верхавая язда (ёй гімназістка нейкі час займалася прафесійна). Гэты від спорту яна выбрала спантанна: даведалася пра секцыю ад дзяўчынкі ў летніку. А дагэтуль чаго толькі ні было: вольная барацьба, лёгкая атлетыка, плаванне, танцы...

Хутка, 23 кастрычніка, у Сафіі прэзентацыя новай кнігі. Апавяданне «Горад сляпых скрыжаванняў» — пра сляпую дзяўчыну: як яна стараецца ўзаемадзейнічаць з іншымі, як свет ставіцца да яе, чым шкодныя стэрэатыпы. Для падлетка — сур'ёзная тэма.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

Урывак з твора Сафіі можна прачытаць на сайце zviazda.by

З гумарам у галаве

«НЯБАЧНАЯ ВАЙНА» ФЁДАРА БУЛКІНА, ці Якія шляхі вядуць у стэндап?

Стэндап — гэта своеасаблівы маналог з гледачом пра ўласнае жыццё, поўны разважанняў і гумару. «Я размаўляю сам з сабою, таму што я адзіны чалавек, чые адказы мне падабаюцца» — жарт знакамітага амерыканскага стэндап-коміка Джорджа Карліна. Гэты жанр камедыі цяпер актыўна развіваецца ў ЗША, Заходняй Еўропе, ва Украіне і ў Расіі. З 2013 года стэндапам займаюцца і беларускія жартаўнікі.

27-гадовы Фёдар БУЛКІН — адзін з найбольш рознабаковых комікаў Мінска — у тэме ўжо больш за чатыры гады. Актыўны і мэтанакіраваны, за гэты час ён паспеў паўдзельнічаць у такіх вядомых камедыйных тэлепраграмах, як «Рассмяшы коміка», «Comedy Батл», «Адкрыты мікрафон» ды шматлікіх беларускіх гумарыстычных праектах. Цяпер ён разам з аб'яднаннем Stand Up Union стварае ўласныя. Аднак шлях жартаўніка пачаўся для Фёдара нашмат раней, яшчэ на малой радзіме ў Смалявічах...

— Раскажыце, калі ласка, як вы сталі комікам...

— Як і многія на постсавецкай прасторы, пачынаў з гульні ў Клубе вясёлых і знаходлівых. Спачатку прыдумляў жарты ў школе. Пасля са зборнай БНТУ прабіліся ў пачатковыя афіцыйныя лігі Міжнароднага саюза КВЗ. У 2014-м пайшоў адтуль і трапіў на «Comedy Батл». Тады і пачаліся мае выступленні ў вобразе прасцецкага хлопца са Смалявічаў.

— А калі перасталі быць «смалявіцкім невукам» і пачалі пісаць маналогі?

— Пасля некалькіх выступленняў у барах на шоу-вечарынах зразумеў, што камедыя ў вобразе і стэндап-камедыя — вельмі блізкія. Адрозненне толькі ў тым, што ў другім выпадку ты са сцэны расказваеш пра сваё жыццё, пра тое, што хвалюе асабіста цябе і пры гэтым чапляе нечым іншых.

— Вы былі адным з першых у Беларусі, хто пачаў займацца гэтым жанрам...

— Амаль. Стэндап у нас з'явіўся недзе ў 2013-м, а я далучыўся праз год. Памятаю, тады арганізоўвалі невялікія вечарыны ў клубе каля станцыі метро «Усход». У ім змяшчалася максімум дваццаць чалавек. Для аўдыторыі жанр быў новы (яшчэ не выходзіла Comedy на канале ТНТ), але ўсё ж памяшканне было заўжды поўнае гледачоў. Я таксама спачатку проста глядзеў, думаў: «О, пацешна», а пасля і сам пачаў пісаць тэксты для выступленняў. Аднак, успамінаю, што яшчэ да гэтага Слава Камісаранка (вядомы стэндапер з Беларусі, рэзідэнт тэлешоу Stand Up. — **Аўт.**) рабіў гумарыстычны канцэрт Cheesecake Factory ў «наргасе», дзе выступала чалавек пяць... Адметна, што ўсе мы не ведалі, што і як пісаць, проста спрабавалі.

— Магчыма, глядзелі на заходні прыклад, стэндап на англійскай мове...

— Так і ёсць. Аднак гэта быў толькі пачатак. Далей з'явіліся самыя розныя гумарыстычныя шоу на ТНТ, гледачы нарэшце ўбачылі камедыю па-руску. Спрабаваць сябе ў жанры стэндап захацелі многія. Але не ў кожнага атрымлівалася. Гэта ж зусім адрознае ад КВЗ, дзе і горыч, і радасць ты дзеліш з камандай. У стэндапе ты — адзін. Сам сабе аўтар, акцёр. І калі што якое, вінаваты толькі ты.

«З псіхалагічнага пункту гледжання стэндап — добры варыянт, каб выказацца і высмеяць любую праблему».

— Колькі комікаў займаецца ў нас гэтым жанрам зараз?

— Чалавек сорак з усёй Беларусі, з іх дваццаць — у Мінску. А са Смалявічаў я адзін такі. Але, спадзяюся, яшчэ будуць... Бо год таму сітуацыя была горшая: дзве-тры пляцоўкі для выступленняў. Цяпер жа іх больш, як і фарматаў праграм. Вельмі папулярны «Адкрыты мікрафон», куды можа запісацца для выступлення абсалютна любы чалавек.

— Аднак не кожны можа стварыць якасную і смешную праграму...

— Гэта так! Для таго каб стаць сапраўдным прафесіяналам, трэба валодаць тэорыяй і, канешне ж, практыкавацца — часцей выходзіць на сцэну. Праграма стэндапа не бярэцца з паветра. Дастаткова адкрыць любую базавую кнігу па пабудове маналогаў. Напрыклад, Джудзі Картэр «Стэндап за 27 дзён». Чытаеш, запамінаеш, пішаш. А паколькі правілы створаны, каб іх парушаць, з кожным новым тэкстам трэба выходзіць за межы стандарту і прыдумляць штосьці сваё, новае, не падобнае ні на што.

— Зразумела, што напісанне жартаў — цяжкая праца. Ці вядома комікам прафесійнае выгаранне?

— Безумоўна! Цудоўна, калі хобі становіцца работай жыцця. Але калі ты ўжо прафесіянал, занятак пачынае надакучваць. Спачатку пачынаеш атрымліваць не такое суперзадавальненне, як раней. Потым можна ўвогуле адчуць агіду да сваёй працы. Быў момант, калі мне зусім не хацелася выступаць: мы з калегамі ў межах праекта аб'ехалі вельмі шмат гарадоў і неверагодна стаміліся. Знаёмае мне і пачуццё поўнай адсутнасці новых ідэй. Калі сядаеш пісаць, а ў галаве — «перакаці-поле». У любым выпадку найлепшыя лекі пры прафесійным выгаранні — банальны адпачынак. А потым — зноў у бой.

— Ёсць меркаванне, што ў стэндап ідуць не ад доўгага жыцця...

— Не заўжды. У любога чалавека, незалежна ад яго ступені заможнасці, ёсць праблемы, якія могуць закрануць і цябе самога. Кожны з нас вядзе вайну, пра якую ніхто і не ведае. Так, некаторыя ідуць у камедыю. Аднак можна ж пайсці і да псіхолага. Дарэчы, з псіхалагічнага пункту гледжання стэндап — добры варыянт, каб выказацца і высмеяць любую праблему. І зала цябе падтрымае!

Нягледзячы на тое што Фёдар ужо дасведчаны комік, ён поўны сіл і жадання ствараць усё больш якасную і рознабаковую камедыю. Відаць, што стэндапер не проста захапляецца сваёй дзейнасцю, а жыве ёй. Рухі, жэстыкуляцыя — энергічныя, голас — бадзёры, у вачах — бляск. Што яшчэ трэба для плённай працы на шляху да прызнання? На думку Фёдара, не хапае медыйнасці і выхаду на інтэрнэт-пляцоўкі.

— Зараз мы ствараем канал на Youtube, куды збіраемся выкладваць запісаныя шоу і праграмы, — дзеліцца ён планамі. — Увогуле, гэта трэба было зрабіць яшчэ тры гады таму, каб нас ужо ведалі. Вось на выступленнях прыезджых комікаў з Масквы, з вядомага Stand Up Club #1, заўсёды поўныя залы. А ўсё таму, што яны робяць сваё асабістае шоу ў інтэрнэце. Аднак мы не слабейшыя ў творчым плане. Надышоў час пашырыць аўдыторыю. І тады, спадзяюся, усё зменіцца!

А пакуль канал развіваецца, вы кожны тыдзень можаце ўбачыць жыўцом добрых беларускіх комікаў у барах Мінска, патрапіўшы на бясплатныя стэндап-шоу, «адкрытыя мікрафоны» і іншыя гумарыстычныя праграмы.

Юлія АДАМОВІЧ,
студэнтка IV курса
факультэта журналістыкі БДУ.

БАНК ТОРГОВЫЙ КАПИТАЛ
Закрытое акционерное общество

Наименование банка:

ЗАО «ТК Банк»

www.tcbank.by

Бухгалтерский баланс на 1 октября 2018 г.

Наименование банка ЗАО «ТК Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.10.2018	01.01.2018
1	2	3	4	5
1	АКТИВЫ			
2	Денежные средства	1101	2 187	1 235
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	225	103
5	Средства в банках	1104	54 091	96 658
6	Ценные бумаги	1105	62 351	86 461
7	Кредиты клиентам	1106	985	674
8	Производные финансовые активы	1107	-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	5 923	5 923
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	23 395	47 019
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	23 165	-
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	9 034	14 740
13	Отложенные налоговые активы	1112	-	-
14	Прочие активы	1113	930	6 121
15	ИТОГО активы	11	182 286	258 934
16	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
17	Средства Национального банка	1201	-	-
18	Средства банков	1202	10 594	91 739
19	Средства клиентов	1203	6 080	3 557
20	Ценные бумаги банка	1204	-	-
21	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
22	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
23	Прочие обязательства	1207	523	1 834
24	ВСЕГО обязательства	120	17 197	97 130
25	СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
26	Уставный фонд	1211	61 651	61 651
27	Эмиссионный доход	1212	17	17
28	Резервный фонд	1213	18 753	15 753
29	Фонды переоценки статей баланса	1214	697	(714)
30	Накопленная прибыль	1215	83 971	85 097
31	ВСЕГО собственный капитал	121	165 089	161 804
32	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	182 286	258 934

Отчет о прибылях и убытках на 1 октября 2018 г.

Наименование банка ЗАО «ТК Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.10.2018	01.10.2017
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	6 364	15 856
2	Процентные расходы	2012	17	6 082
3	Чистые процентные доходы	201	6 347	9 774
4	Комиссионные доходы	2021	76	424
5	Комиссионные расходы	2022	105	77
6	Чистые комиссионные доходы	202	(29)	347
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	(1 062)	(281)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	(229)	437
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	-	-
11	Чистые отчисления в резервы	207	(4 654)	(14 993)
12	Прочие доходы	208	8 570	24 741
13	Операционные расходы	209	15 578	30 350
14	Прочие расходы	210	90	1
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	2 583	19 660
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	714	2 855
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	1 869	16 805

Заместитель Председателя Правления Д.В. Власенко

Главный бухгалтер Н.А. Тиванова

Дата подписания: 2 октября 2018 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь, № 30 от 19.06.2013, БИК 153001333, УНП 807000163.

Закрытое акционерное общество «ЮНИМИТ» (222220, Республика Беларусь, Минская обл., Смолевичский район, Плисский сельсовет, 9/12, в районе поселка Октябрьский) сообщает, что директором ЗАО «ЮНИМИТ» 12.10.2018 принято решение о формировании реестра владельцев ценных бумаг. Формирование реестра акционеров осуществляется на 12.10.2018.
УНП 690660279

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Калинковичский мясокомбинат», Гомельская обл., г. Калинковичи, ул. Северная, 8

Предмет аукциона
Месторасположение: Гомельская обл., Калинковичский р-н, Липовский с/с, аг. Липов, ул. Советская, 26

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инвентарный номер
Здание комплексного приемного пункта	161,4 кв. м	333/С-24121

Сведения о земельном участке: пл. **0,0415 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания комплексного приемного пункта

Начальная цена с НДС 20 % – 12 928,58 бел. руб. (снижена на 20 %)

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 27.09.2018

Аукцион состоится 02.11.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 31.10.2018** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. www.cpo.by**. Email: auction@cpo.by**

ООО «БелИнвестОценка» извещает о проведении повторного открытого аукциона в г. Любани ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ Филиалом № 6 «Любанский КСМ» ОАО «Белорусский цементный завод»

Лот № 1: Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4727, площадью 70,9 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., **г. Любань**, ул. Боровика, 44Б-1. Начальная цена продажи – **7 680** рублей, в т. ч. НДС – 1 280 руб.

Лот № 2: Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4728, площадью 67,9 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., **г. Любань**, ул. Боровика, 44Б-2. Начальная цена продажи – **7 380** рублей, в т. ч. НДС – 1 230 руб.

Лот № 3: Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4729, площадью 68,6 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., **г. Любань**, ул. Боровика, 44Б-3. Начальная цена продажи – **7 440** рублей, в т. ч. НДС – 1 240 руб.

Лот № 4: Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4730, площадью 67,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., **г. Любань**, ул. Боровика, 44Б-4. Начальная цена продажи – **7 260** рублей, в т. ч. НДС – 1 210 руб.

Лот № 5: Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4731, площадью 67,4 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., **г. Любань**, ул. Боровика, 44Б-5. Начальная цена продажи – **7 320** рублей, в т. ч. НДС – 1 220 руб.

Лот № 6: Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4732, площадью 88,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., **г. Любань**, ул. Боровика, 44Б-6. Начальная цена продажи – **9 540** рублей, в т. ч. НДС – 1 590 руб.

Лот № 7: Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4733, площадью 88,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., **г. Любань**, ул. Боровика, 44Б-7. Начальная цена продажи – **9 540** рублей, в т. ч. НДС – 1 590 руб.

Лот № 8: Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4735, площадью 89,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., **г. Любань**, ул. Боровика, 44Б-8. Начальная цена продажи – **9 660** рублей, в т. ч. НДС – 1 610 руб.

Лот № 9: Тепловоз ТГМ-4, № 2435 с инвентарным № 1081922 адресу: Минская обл., Любанский р-н, **Юшковичский с/с, 2/2**. Начальная цена продажи – **59 598** рублей, в т. ч. НДС – 9 933 руб.

Извещения о предыдущих несостоявшихся аукционах по данным лотам было опубликовано в газете «Звязда» от 25.07.2018 г. № 140, от 05.09.2018 г. № 170, от 25.09.2018 г. № 184.

Аукцион состоится **09.11.2018 г.** в **14.00** по адресу: Минская обл., Любанский р-н, п/о Смольгово (Филиал № 6 «Любанский КСМ»).

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется Организатору аукциона на р/с № BY29BPSB30121505440129330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBB2. Получатель – ООО «БелИнвестОценка», УНП 191692351.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по 08.11.2018 г. включительно по адресу: 220108 г. Минск, ул. Казинца, 62, оф. 910 или тел./факс 8(017)398-29-44, e-mail: belinvo@tut.by. Заключительная регистрация участников – 09.11.2018 г. с 12.00 до 13.45 по месту проведения аукциона.

Участник, ставший победителем аукциона, обязан заключить договор купли-продажи с ОАО «Белорусский цементный завод» не позднее 10 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8 (017) 398-29-44, 8 (029) 615-40-08, e-mail: belinvo@tut.by

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды сроком на 3 (три) года помещения, принадлежащего УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги»

Лот № 1. Право заключения договора аренды Объекта. Помещение площадью 33,2 кв. м в здании бытового помещения с инв. № 450/С-26008. Адрес: Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Вокзальная. **Начальная цена продажи, с НДС –** 133,71 бел. руб. **Сумма задатка –** 13,37 бел. руб. **Шаг аукциона:** 5 %. **Размер ежемесячной арендной платы за сдачу в аренду Объекта:** 7,97 базовых арендных величин.

Условия аукциона: 1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести лот (лоты) по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор аренды Объекта в течение 10 (десяти) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона.

2. В договоре аренды будет предусмотрено одним из условий расторжения договора по требованию арендодателя – производственная необходимость. Помимо договора аренды с арендатором будут заключены договоры о взаимоотношениях в части электроснабжения и теплоснабжения.

3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе лота в течение 3 (трех) банковских дней с назначенной даты проведения аукциона.

4. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить Организатору аукциона стоимость услуги Организатора аукциона и стоимость затрат Организатора аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

5. Целевое назначение: размещение офиса.

6. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Расчет ежемесячной арендной платы выполнен в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29 марта 2012 г. № 150. Базовая арендная величина с 01.04.2018 равна 16 руб. 11 коп.

Цена продажи Лота не засчитывается в арендную плату, подлежащую уплате в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Размер штрафа, в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, составляет 1 000,00 белорусских рублей.

Аукцион состоится 20.11.2018 в 14.15 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже Лота № 1, принадлежащего УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги», проводимом 20 ноября 2018 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 16.11.2018 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта – Финогенова Ольга Николаевна, тел. 8 (0163) 49-51-46.

Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды сроком на 3 (три) года имущества, принадлежащего УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги»

Лот № 1. Право заключения договора аренды Объекта: 1. 1,0 кв. м пола в пассажирском здании с инвентарным номером 621/С-13589. Адрес: Минская обл., Несвижский р-н, г. п. Городея, ул. Вокзальная, 8. **Начальная цена продажи, с НДС** – 4,03 бел. руб**. Сумма задатка** – 0,40 бел. руб. **Шаг аукциона:** 5 %. **Размер ежемесячной арендной платы за сдачу в аренду Объекта:** 3,0 базовые арендные величины.

Условия аукциона: 1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести лот (лоты) по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор аренды Объекта в течение 10 (десяти) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона.

2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе лота в течение 3 (трех) банковских дней с назначенной даты проведения аукциона.

3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить Организатору аукциона стоимость услуги Организатора аукциона и стоимость затрат Организатора аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

4. Целевое назначение: размещение кофейного автомата.

5. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Расчет ежемесячной арендной платы выполнен в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29 марта 2012 г. № 150. Базовая арендная величина с 01.04.2018 равна 16 руб. 11 коп.

Цена продажи Лота не засчитывается в арендную плату, подлежащую уплате в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Размер штрафа, в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, составляет 1 000,00 белорусских рублей.

Аукцион состоится 20.11.2018 в 13.45 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Продавец: УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» Барановичская дистанция гражданских сооружений, 225407, г. Барановичи, ул. Вильчковского, 5, тел. 8 (0163) 49-33-12.

Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, помещение 9, тел. 8 (017) 324-70-57.

